№ 32 (342) 5 верасьня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднолуленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Тэма нумару:

**сэкс** у інтэрнатах. Старонка 5

**сэкс** ідалы. Старонка 12

**сэкс** у сталічных бардэлях. Старонка 6

**сэкс** на паліндроме. Старонка 13

## Падпіску на трэці квартал

(кастрычнік—сьнежань) прымаюць на поштах і ў шапіках «Белсаюздруку». Падпіскаю газэта абыдзецца таньней, асабліва калі падпісвацца на шапік (у Менску). Падпісны індэкс 63125. Цана на месяц 2043 рублі, на шапік — 1360 рублёў.

Беларусь мяняецца — «Наша Ніва» застаецца. Газэта і надалей будзе незалежнаю, salіднаю, пазытыўнаю.

**Дык падпісвайся!**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Лявон Баршчэўскі:

### «З свабоды пачынаецца і свабодай канчаецца сапраўдная літаратура»

Пасада кіраўніка Беларускага ПЭН-цэнтру засталася вакантнай пасьля сьмерці Васіля Быкава. 3 верасьня Рада ПЭН-цэнтру, які гуртуе самых вядомых пісьменьнікаў і журналістаў дэмакратычных перакананьняў, абрала новым старшынём арганізацыі вядомага перакладчыка і грамадзкага дзеяча Лявона Баршчэўскага. Як адзначыў на сходзе ПЭНу Валянцін Тарас, «Лявон будзе выконваць *ролю* Быкава, бо гэта немагчыма, але ён будзе выконваць *волю* Быкава». Адразу пасьля абраньня Лявон Баршчэўскі адказаў на пытаньні карэспандэнта «НН».

**«НН»: Што Вы лічыце сваёй галоўнай задачай на гэтай пасадзе?**

**Л.Б.:** ПЭН-цэнтар зарэкамэндаваў сябе як салідная арганізацыя, якая мае аўтарытэт і якую пабойваюцца ўлады. Пагаршаецца сытуацыя з свабодай слова ў Беларусі. Гэта патрабуе большае рэакцыі ПЭНу. Яшчэ адзін кірунак дзейнасьці — змаганьне з цэнзурай ва ўсіх яе праявах. У тым ліку і з самацэнзурай. Маладым літаратарам трэба тлумачыць, што свабода ёсьць тым, з чаго пачынаецца і на чым канчаецца сапраўдная літаратура.

Працяг на старонцы 3.

# СЭКС тут і цяпер

**У Беларусі доўжыцца эканамічны ўздым. Даляравая цана нерухомасьці расьце на 2—3% у месяц. Такія часы «тлустых кароваў» — залатая пара і для сэкс-індустрыі. Грамадзтва разьнявольваецца ды прагне асалодаў.**

**Сьціраецца мяжа між зонамі сораму й пасіўнай зацікаўленасьці. Вось тыповае пытаньне-адказ з газэты «Хозяюшка», разьлічанай на шырокія слаі хатніх гаспадыняў і дачніцаў: «Я займаюся анальным сэксам. Ці можна пры гэтым зацяжарыць?» У «Народнай волі» Кулінковіч распавядае, што любіць порна, і раіць, якія порнакасэты глядзець. Сэкс-індустрыя СМІ стварае сэкс-ідалаў. (Пра гэта з добрым сарказмам на старонках 12—13.) Гэта добра ці дрэнна? Гэта ўсьведамлена непазьбежна. Сэкс-ідалаў Курнікаву й Эмінэма, Шадрыну й Чэкераса можна лічыць прыгожымі ці непрыгожымі. Аднак ніхто не наважыцца сказаць, што гэтыя «маральныя аўтарытэты» заахвочваюць моладзь да клясавага ці нацыянальна-вызвольнага змаганьня, калі карыстацца марксісцкай тэрміналёгіяй.**

**10 гадоў таму гэтага не было (гл. апытаньне на старонцы 5). Прынамсі, у нас. Прынамсі, у такой ступені.**

**Калі сэкс-свабода робіцца модай і абавязкам, яна таксама ператвараецца ў форму нявол, прытым вельмі жорсткай. Паўлё Каэльё добра выказваецца пра гэта ў сваёй новай кнізе «Адзінаццаць хвілінаў» (таго самага): сапраўдны сэкс ня мае нічога супольнага з тым, што нам прапануюць у працэсе яго піяр-кампаніі.**

**Нягледзячы на няўхільную фармалізацыю рэлігіяў і індывідуалізацыю веры, большасьць беларусаў пачалі свой «сэксуальны шлях» пасьля дваццаці. Калі ўлічыць, што мужчыны ў нас у сярэднім жэняцца ў 22—23, а жанчыны — у 20—21 год, дык і зусім недалёка ад часу вянчаньня. Гэтыя зьвесткі выявіла апытаньне БелаПАН (старонка 5). Гары Куманецкаму, які нядаўна перабраўся з каталіцкае Вільні ў праваслаўны Менск, не хапае колераў і спэцыяў (старонка 7). Беларускі сэкс застаецца цнатлівым і «па каханьні». Гэта пацьвярджае і дасьледаваньне сэксуальнага жыцьця ў інтэрнатах, дзе беларускі сэкс захоўваецца ў сваім «першабытным стане» (старонка 5).**

**Які ты, сучасны сэкс? Вечная тэма новага нумару «НН». Старонкі 5—15.**



## Ліцэй на вольным паветры

**Першыя школьныя заняткі навучэнцы Беларускага ліцэю правялі пад адкрытым небам. У будынак, дзе паранейшаму не вядзецца ніякага рамонту, іх не пускае міліцэйская варта. Ліцэісты слухаюць лекцыі, пасеўшы на зьбітыя бацькамі драўляныя лавы блізу стадыёну «Дынама». На наступным тыдні вучні пяройдуць пад дах.**

Працяг на старонцы 3.



ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

# «БДГ» вярнулася

3 верасьня, пасьля доўгага перапынку, выйшла «Беларуская деловая газета». Аднак лёс выданьня пакуль няпэўны. У рэдакцыі спадзяюцца, што сытуацыя павінна праясьніцца цягам бліжэйшага тыдня.

Тыя тры месяцы, на якія Міністэрства інфармацыі прыпыніла «БДГ», газэта выходзіла пад іншымі лягатыпамі, друкавалася як у Беларусі, так і за мяжой. Усяго выйшлі дванаццаць нумароў «нелегальнай» «БДГ». Першы «легальны» нумар быў таксама надрукаваны за мяжой — у Смаленску. Беларускія друкарні чакаюць дазволу зьверху, якога пакуль няма. Паводле словаў галоўнай рэдактаркі «БДГ» Сьвятланы Калінкінай, Мінінфармацыі заяўляе пра тое, што канфлікт вычарпаны і беларускія друкарні могуць друкаваць газэту. Але друкарні чакаюць інструкцый — не адмаўляюць у друку, але і не пагаджаюцца на яго. Сыстэмы дзяржаўнага распаўсюду прэсы дамовы з «БДГ»аднавілі.

«Улады проста цягнуць час, — кажа С.Калінкіна. — Думаю, што гэта будзе працягвацца да канца тыдня. І яны будуць глядзець, ці зразумела «БДГ» намёк. Мы яго зразумелі, але не зьбіраемся адступаць ад канцэпцыі нашага выданьня. Будзем пісаць не пра віртуальныя рэчы, а пра рэальныя».

Досьвед «БДГ», якая ўжо тры месяцы змагаецца за існаваньне, можа быць вельмі карысным і для іншых незалежных выданьняў. Між іншым, кіраўніцтва газэты здолела захаваць калектыў.

У сьвежым нумары «БДГ» — журналісцкае расьсьледаваньне арышту сямі супрацоўнікаў Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта «Белая Русь», які ажыцьцявіла КДБ.

**Алег Тачоны**

# Гетман Астроскі сёньня



**Напярэдадні Дня вайсковай славы мы папрасілі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту адказаць на пытаньне: «Калі б пераможца 1514 году гетман Канстанцін Астроскі жыў у наш час, чым бы ён займаўся?».**

**Павал і Алесь, II курс:**
Хутчэй за ўсё, Канстанцін Астроскі арганізоўваў бы нацыянальнае войска. Сапраўды нацыянальнае і па духу, і па выхаваньні. Ён бы працягнуў сваю дзейнасьць, накіраваную на ўмацаваньне незалежнасьці Беларусі.

**Таня, III курс:**
Ён быў бы дысыдэнтам, жыў бы цяпер за мяжой.

**Андрэй, III курс:**
Сядзеў бы.

**Таня і Воля, II курс:**
Ён бы стаў бізнэсмэнам.

**Юры, III курс:**
Быў бы кіраўніком дзяржавы. Калі б ён жыў, можа, у нас была б не рэспубліка, а княства якое ці нейкая іншая форма кіраваньня.

**Мікола, V курс:**
Ён быў бы вядомым вайсковым дзеячом, але часткова прысьвячаў бы сябе мэцэнацтву. Даваў бы грошы на патрыятычнае выхаваньне моладзі.

**Аляксандар, II курс:**
Чым бы мог займацца Канстанцін Астроскі ў наш час мэркантылізму і прагі грошай?.. Вайсковай справай ён бы не займаўся дакладна, таму што як такога моцнага войска няма. У нашай краіне гэта непэрспэктыўна.

**Зьміцер, II курс:**
Магчыма, быў бы міністрам замежных справаў?

**Тацяна, II курс:**
Ён бы распрацоўваў новую палітыку для рэспублікі. Яна вельмі патрэбная. Па-першае, трэба ратаваць нашу мову. Я вось вучуся на расейскім аддзяленьні і сутыкнулася з тым, што на нашым аддзяленьні мала хто ведае беларускую мову. Чатыры чалавекі — гэта максымум. Таму менавіта ён быў бы палітык, аднак вельмі шчыльна зьвязаны з культурай.

**Саша і Андрэй, I і II курс:**
Няважна, кім бы ён быў. Можна і простым рабочым рабіць унёсак у разьвіцьцё краіны.

**Аляксей, II курс:**
Даў бы сваёй булавой па галаве сёньняшняй уладзе.

**Зьміцер, III курс:**
Мы ні з кім не ваюем. Таму, напэўна, Канстанцін Астроскі быў бы мэрам Менску.

Мяркуючы па апытаньні, беларускія студэнты не ўспрымаюць наш час як гераічны. Аднадушша ў тым, якое поле дзейнасьці цяпер прыдатнае для сапраўднага мужчыны, няма.

**Апытвала Вераніка Дзядок**

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

## Тлумачце дзецям самі

Да артыкулу «Левы бок школы» з №31. Калі мы ўсьвядомілі, што нават дзяржтэлебачаньне існуе на нашы падаткі, дык як можна пісаць пра бясплатную адукацыю? Ці адукацыя ў нас ня з тых жа падаткаў мае грошы? А калі так, дык маеце правы патрабаваць і падручнікі, і настаўнікаў, і мову навучаньня, і рамонт, і г.д. — гэта ўсё аплачана НАМІ праз падаткі.

Дзіўна чытаць, што дзіця ў трэцяй клясе ня ведае, што такое мікраарганізмы, а яго бацькі ня могуць патлумачыць пра трыльярд або кубічны сантымэтар. Мой сын ведае пра ўсё гэта і, акрамя таго, пра функцыі сэрца і крыві, мозгу і навошта трэба есьці ды спаць, чысьціць зубы, мыць рукі і ня есьці нямытага, а таксама што мыла, якое забівае «ўсе вядомыя бактэрыі», больш шкоднае за нямытыя рукі і чаму. Калі некаторыя бацькі спадзяюцца толькі на настаўнікаў, дык гэта іхная бяда.

**Дзьмітры Вінчэўскі, tut.by**

# Вялікія таямніцы

**Ніл Гілевіч прызнаўся, што Францішак Вядзьмак-Лысагорскі, які напісаў «Сказ пра Лысую гару», — гэта ён. Адна таямніца беларускай культуры раскрылася, але ж колькі яшчэ засталося. Па разгадкі іншых загадак нашае гісторыі ды культуры карэспандэнт «НН» зьвярнуўся да спэцыялістаў.**



## Дзе залатыя апосталы нясьвіскіх Радзівілаў?

**Адам Мальдзіс, прафэсар:** Дасьледчык Аляксей Ненадавец з Бабруйску вывучыў гэтае пытаньне. У падрыхтаваным да друку зборніку «Вяртаньне-8. Супольная спадчына» будзе ягоны артыкул пра радзівілаўскіх апосталаў. Самі ж дванаццаць статуяў недзе ў лёху пад замкам ці пад азёрамі. Дачка апошняга нясьвіскага ардыната пані Тамашэўская (паводле мужавага прозьвішча) падчас свайго прыезду ў Нясьвіж пры канцы 90-х паказвала на стаў зь левага боку ад замку і казала: «Там нашыя найбольшыя скарбы».

## Хто напісаў паэму «Лука Мудзішчаў — прэзыдэнт»?

**Усевалад Рагойша, намесьнік рэдактара газэты «Свабода» ў 1996 г.:** Ніколі мы гэтага не дазнаемся. Найхутчэй яе пісаў не прафэсійны літаратар, а чалавек, для якога паэма была грамадзянскім учынкам. Гэты твор ня мае такога літаратурнага значэньня, як «Сказ пра Лысую гару». Аўтару «Мудзішчава» літаратурнай славы ня трэба, а іншая сёньня небясьпечная. А пры зьмене палітычных умоваў паэма страціць сваю актуальнасьць. Ня думаю, што аўтар сам захоча прызнацца. Каб яму гэта было трэба, ён бы пра сябе час ад часу нагадваў як-небудзь. Але нават у «Свабоду» ліст прыйшоў ня поштай: нехта пакінуў у вахцёра капэрту, і вахцёр ня мог пазьней прыгадаць, жанчына ці мужчына.

## Дзе бел-чырвона-белы сьцяг Першага слуцкага палка войскаў БНР?

**Ніна Стужынская, гісторык:** Сьцяг рабілі жанчыны, а да жано-

## Беларускі Калегіюм

Прапануе дадатковае навучаньне па спэцыялізацыях: філязофія/літаратура; журналістыка; найноўшая гісторыя.

Запрашающца студэнты старшых курсаў гуманітарных спэцыяльнасьцяў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У выключных выпадках прымаюцца й студэнты малодшых курсаў. Навучэнцам БК можа быць той, хто пастаянна альбо на час навучаньня пражывае ў Менску.

Навучаньне бясплатнае. Сэртыфікат БК не замяняе дыплёму аб вышэйшай адукацыі. Пачатак заняткаў з 1 кастрычніка 2003 г.

Запіс на сумоўе — да 22 верасьня. Абавязковай умовай запрашэньня на сумоўе зьяўляецца падача да пазначанай вышэй даты аднаго альбо некалькіх уласных тэкстаў (ня менеш за 5000 знакаў). Для сумоўя па спэцыялізацыі «найноўшая гісторыя» тэксты неабавязковыя. Даведкі праз т.: 220-63-36 (з 14.00 да 18.00 апроч суботы і нядзелі).

КАЛЯНДАР

## «Харлей-Дэвідсан»

**Вільям С. Харлей і Артур Дэвідсан, каб пражылі гадоў па сто трыццаць, сьвяткавалі б цяпер 100-гадовы юбілей свайго стварэньня — культавага матацыкла «Харлей-Дэвідсан». Адзначаюць гэтую дату байкеры ўсяго сьвету. У Беларусі ўсяго дзесяць сапраўдных «харлеяў». Каштуе такая цацка 40 тыс. даляраў.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Капіталізм у школе і як яго ўзаконіць

Калі аўтар гэтых радкоў скончаў сярэднюю навучальную ўстанову, ён ня мог сабе ўявіць, што ўсяго праз некалькі гадоў яму давялося б прасіць грошы ў сваіх бацькоў на падручнікі, рамонты, падарункі і інш. Цяпер гэта рэальнасьць, зь якой усе пачынаюць маўкліва звыкацца. Адбываецца частковая камэрцыялізацыя сярэдняй адукацыі, частка коштаў дадзенай паслугі пакрываецца яе спажыўцамі — сем'ямі вучняў. Эканамічная тэорыя сьцьвярджае: лепш, калі спажыўцы самі плацяць за атрыманую імі паслугу, чым калі за тую паслугу плацяць іншыя людзі — падаткаплатнікі. Такім чынам дасягаецца эфэктыўнасьць усёй эканамічнай сыстэмы ў цэлым. Таму камэрцыялізацыя і прыватызацыя заўжды прыносяць станоўчыя вынікі. Але, трэба дадаць, так бывае ў краінах з нармальным капіталізмам, дзе пануе закон. Беларуская мадэль сапраўднага «дзікага» капіталізму дае іншыя вынікі. Камэрцыялізацыя сярэдняй адукацыі, што адбываецца ў нас, мае цалкам нефармальны і нават незаконны характар. Наўрад ці школкі маюць дазволы на правядзеньне апэрацыяў з наяўнымі грашыма, якія яны зьбіраюць з бацькоў, і іншыя патрэбныя для такой дзейнасьці дакумэнты. Але, як бачым, мясцовыя ўлады і Міндукацыі, што кантралююць гэтыя працэсы, зусім ня супраць. Бо гэта ў іх інтарэсах — прымусіць людзей плаціць за тое, што згодна з законам мусіць быць дармавым, і зэканоміць такім чынам уласныя сродкі, якіх дзяржава дае ім шторазу менш. Але найбольш небясьпечны тут не эканамічны, а сацыяльны бок праблемы. Калі людзі прызвычайваюцца жыць, парушаючы закон, і калі ўладамі гэта заахвочваецца, адбываецца пэўная інстытуталізацыя дадзенай практыкі. Утвараецца нефармальны сацыяльны інстытут, такі самы, як інстытут хабарніцтва ці г.зв. «блату»: як быццам бы бюджэтная ўстанова — школа — функцыянуе часткова за сродкі грамадзян, чые дзеці ў ёй вучацца. Сацыяльны інстытут — гэта пісаныя і няпісаныя нормы, што рэгляментуюць паводзіны людзей. Сацыяльны інстытут, асабліва нефармальны, — зьява сталая і інэртная, яна мала паддаецца ўплыву дзяржавы. Таму калі цяпер узьнікне інстытут, пра які мы вядзём гаворку, зьмяніць яго з надыходам іншых часоў будзе вельмі складана.

З сытуацыі ёсьць адно выйсьце, прычым зусім нескладанае. Калі ўжо фактычна існуе нефармальны інстытут, дык дзяржаве трэба зрабіць усё магчымае, каб ператварыць яго ў фармальны. Грашовыя плыні, што цяпер знаходзяцца ў «шэрай», нефармальнай сфэры, трэба папросту легалізаваць. Дастаткова пры кожнай школе заснаваць апякунскую раду з асобным рахункам у банку. У такую раду могуць уваходзіць бацькі дзетак і выпускнікі дадзенай установы. Менавіта яны будуць вырашаць, колькі грошай трэба школе і ў які спосаб тыя сродкі будуць выкарыстоўвацца. Такі крок ніяк не паўплывае на велічыню выдаткаў дзяржавы і насельніцтва краіны на адукацыю, але зробіць усю сыстэму сярэдняй адукацыі празрыстай і падкантрольнай бацькам, зьліквідуе глебу для карупцыі і не дазволіць усталявацца небясьпечнаму інстытуту паўпрыватнай школьнай адукацыі. І, што ня менш істотна, усё будзе згодна зь літарай ЗАКОНУ.

**Дамінік Міхайловіч**

# За дзяржаву або за сябе

Перад пачаткам палітычнага сэзону й сваім днём народзінаў Аляксандар Лукашэнка наведаў малую радзіму — Аршаншчыну. Паліттэхнолягі раяць рабіць гэта на старце выбараў або буйных кампаніяў: так бы мовіць, *архетып Антэя*. Паездка тым больш сымбалічная, што сілаў ад роднае зямлі Аляксандар Рыгоравіч набіраўся напярэдадні 8 верасьня — гадавіны бітвы пад Воршай.

Менавіта з Расеяй сёньняшняму рэжыму даводзіцца змагацца за «трэці тэрмін» і кантроль над краінай. Вырашальнае сутыкненьне назіраецца: неўвядзеньне расейскага рубля, канстытуцыйны акт, прыватызацыя «Белтрансгазу» й нафтахіміі, уніфікацыя заканадаўства ды тэрміны «саюзнае дамовы» штодня завязваюцца ва ўсё больш пагрозьлівы вузел, які падлягае не развязваньню, а расьсяканьню. Застаецца варыянт раптоўнага ўдару, які дае перамогу адным махам, — стратэгія Канстанціна Астроскага ў 1514 г.

Найважнейшы шанец *(Карла Маркса, 38)* у гэтай бітве — расейскія выбары. Крэмль заняты, абмежаваны ў магчымасьцях адкрытага ціску, маскоўская эліта групуецца па розныя бакі барыкадаў. Значыць, беларускія падзеі могуць разгортвацца «пад прыкрыцьцём» думска-прэзыдэнцкае кампаніі або нават у яе рэчышчы. Вельмі верагодна, што ўлада дачакаецца расейскіх парлямэнцкіх выбараў і ў залежнасьці ад выніку сваіх хаўрусьнікаў, левых, распачне ўласны сцэнар, кульмінацыяй якога стане рэфэрэндум падчас «выбараў Пуціна». Ход моцны: хоць і завочны, але двубой з Пуціным і запраграмаваны выйгрыш. Лукашэнка атрымлівае яшчэ плюс пяць гадоў прэзыдэнцтва, а «ВВП» — усяго чатыры... Скемілі? Пасьля Пуціна можна й на Крэмль зноў замахнуцца.

Вядома, рэсурсы Менску меншыя за крамлёўскія. Але й Астроскі меў 35 тысячаў войска супраць 80 тысячаў маскоўскіх! Прынцыповая розьніца паміж верасьнем 1514 г. і верасьнем 2003-га толькі адна: той біўся за дзяржаву, гэты — за сябе.

Зрэшты, новая бітва пад Воршай — інфармацыйная, эканамічная, палітычная ліквідацыя расейскага ўплыву — немінучая і пасьля Лукашэнкі. Немінучая, як сама Ворша на дарозе зь Менску да Масквы. І ў чым той жа Лукашэнка мае рацыю — беларускія дзеяньні мусяць быць выключна наступальнымі.

Ну, а гадавіну тае гістарычнае перамогі Беларусь будзе адзначаць сёлета ў нядзелю 6 верасьня. Што цікава, у дзень народзінаў «Маладога фронту» (1997) і БРСМ (2000). Тамсама, на Крапівенскім полі пад Воршай.

**Павал Севярынец**

# Беларусі




чага ў нас заўжды ставіліся несур'ёзна. Калі і знойдзецца гэты сьцяг, дык не ў эмігранцкіх сховах. Там часта гаворка ішла пра выжываньне, а не пра захаваньне дакумэнтаў і рарытэтаў. Таму ў 20—30-я ў Эўропе квітнеў гандаль эміграцкімі дакумэнтамі. Найверагодней, сьцяг у маскоўскіх архівах ФСБ. У Маскве цяпер захоўваецца Праскі архіў белай эміграцыі, куды трапілі вельмі многія дакумэнты з архіву БНР.

## Ці сам памёр Янка Купала?

**Віталь Скалабан, архівіст:** У нашых архівах знайшліся новыя цікавыя матэрыялы, над якімі я цяпер



працую. Праўда, ня думаю, што ўдасца паставіць кропку ў гэтым пытаньні.

**Апытваў Адам Воршыч**

# Ліцэй на вольным паветры

Працяг са старонкі 1.

141 навучэнец Гуманітарнага ліцэю гэткім чынам пачаў заняткі 1 верасьня. Ля будынку на вул.Кірава сабралася 700 чалавек. Сьвята пачалося зь сьпеваў сурмы: прыйшоў падтрымаць ліцэістаў Уладзімер Пузыня. Вучні пакляліся ў вернасьці ліцэю, прасьпявалі ліцэйскі гімн ды ўсклалі кветкі да адабранага будынку. Уладзімер Колас сказаў уступнае слова і даў першы званок. Ва ўнісон зазьвінелі званочкі, прынесеныя кожным ліцэістам.

Пасьля былі лекцыі акадэміка Радзіма Гарэцкага, рэжысэра Валер'я Мазынскага, сьпевака Лявона Вольскага, прафэсара моваznаўства Пятра Садоўскага ды інш. Экстрэмальнасьць умоваў навучаньня кідалася ў вочы: некаторыя лавы не вытрымлівалі «грузу ведаў» і ламіліся пад ліцэістамі. 2 верасьня заняткі пад адкрытым небам працягваліся: ангельская мова, геаграфія, старажытная літаратура... Гэтак ліцэісты маюць вучыцца да канца тыдня, потым жа пяройдуць пад дах: будуць прыходзіць на кансультацыі да выкладчыкаў дадому.

У першыя дні новага навучальнага году падтрымку ліцэістам выказалі выпускнікі славутай Віленскай беларускай гімназіі. Але ніводзін чыноўнік да ліцэю не прыйшоў. Уладу тут прадстаўлялі толькі міліцыянты пад кіраўніцтвам сумнавядомага падпалкоўніка Пятра Вараб'ёва.




Міністар Аляксандар Радзькоў на прэс-канфэрэнцыі 29 жніўня ня даў уцямнага адказу ні наконт сытуацыі з будынкам, ні нават наконт Менскага гуманітарнага ліцэю, які мусілі стварыць улады. Не сказаў ён і пра тое, што колькасьць беларускіх школаў у краіне скарачаецца: да 2010 г. маюць быць закрытыя 444 вясковыя школы (бальшыня зь іх беларускія). Вучняў зь іх найчасьцей пераводзяць у расейскамоўныя навучальныя ўстановы. Нават у гарадох. Вучні 11-й беларускай клясы менскай школы №143 давучвацца будуць па-расейску. Дырэктар патлумачыў гэта «інтэграцыяй» дзьвюх клясаў — беларускай і расейскай — у адну. Выбар мовы навучаньня быў зроблены на карысьць расейскай. У менскай беларускай школе №2 сёлета набралі расейскамоўную падрыхтоўчую клясу. Дырэктарка Галіна Яскевіч тлумачыць гэта аб'ектыўнай неабходнасьцю: «У нас недабор. Пры такой сытуацыі праз два гады школу ўвогуле маглі б закрыць. У беларускую клясу падалі ўсяго 15 заяваў, таму мы наважыліся набраць расейскамоўную клясу».

Пакуль толькі ліцэй мае дастаткова моцы, каб супраціўстаяць. Іншыя ж беларускія настаўнікі з надзеяй глядзяць на гэтае змаганьне. У першы дзень верасьня яны перадалі сваім калегам букеты кветак і словы падтрымкі.

**Аркадзь Шанскі**

# ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Крэдыты на адукацыю

**«Беларусбанк» пачаў даваць крэдыты на атрыманьне першае вышэйшае адукацыі.** Максымальны гадавы памер крэдыту — да 70% кошту адукацыі за год. Аддаць яго трэба найпазьней праз пяць гадоў пасьля сканчэньня вучобы. Калі адлічаць з ВНУ — праз год.

## Гарачая вада пахаладнее

**Менскія ЖЭСы вывесілі ў пад'ездах графік падачы гарачае вады.** Да звыклых 50 градусаў яе будуць нагрherаваць з 5.00 да 9.00, з 11.00 да 14.00 і з 17.00 да 22.00 — усяго 12 гадзін у суткі. У прамежках вада будзе халаднець да 43°С. А ад 0.00 да 5.00 з крана пацячэ летняя вадзічка — 35°С. Менск ня ўклаўся ў рамкі эканоміі энэргіі, цяпер наганяе. У кастрычніку ваду пачнуць награваць як след.

## Вось такія пірагі

**Гомельскі аблвыканкам стварае ў Мазыры сумеснае прадпрыемства па вытворчасьці мукі зь цьвёрдых сартоў пшаніцы.** Інвэставаць у праект бярэцца бізнэс-колы ЗША. Мяркуецца выпускаць разнастайныя гатункі макароны, замарожанага цеста і вырабаў зь яго. Мука будзе імпартавацца з краінаў Заходняй Эўропы. Прадукцыя пойдзе на беларускі і замежныя рынкі.

## «Забудова» і немцы

**ААТ «Забудова» пачала рабіць у Чысьці плітку для ходнікаў на нямецкім абсталяваньні.** Такая плітка служыць у паўтара разу даўжэй за звычайную. Прадпрыемства пляне выраблець каля 20 найменьняў прадукцыі, у тым ліку і плітку для паркавальных стаянак — з адтулінамі для газоннай травы.

## У нас выхоўваюць, у Расеі кантактуюць

**Пастановай Мінпраці ў Кваліфікацыйны даведнік «Пасады службоўцаў для ўсіх галін эканомікі»** ўнесеная пасада намесьніка кіраўніка арганізацыі па ідэалягічнай справе. Расейцы тым часам увялі пасады спэцыялістаў па сувязях з грамадзкасьцю.

## Бэнзын падаражэў

**Ад 1 верасьня цэны на бэнзын і дызэльнае паліва падвысіліся на 12%.** Цяпер літар 76-га бэнзыну каштуе 955, 92-га — 1190, 95-га — 1370, а дызэльнага паліва — 930 руб. «Белнафтахім» тлумачыць гэта ростам цэнаў на бэнзын і мазут на сусьветным рынку.

## «Газпром» абыходзіць Беларусь

**«Газпром» і «Нафтагаз Украіны» зьбіраюцца за тры-чатыры гады збудаваць газапровад ад Казахстану да Вугоршчыны (1,5 тыс. км), каб штогод транспартаваць 28 млрд м³ газу.** Кошт праекту 2,5 млрд даляраў. Новы газапровад можа прымусіць «Газпром» адмовіцца ад праектаў «Ямал — Эўропа» (праз Беларусь і Польшчу ў Нямеччыну) і паўночнаэўрапейскага газаправоду (у Нямеччыну праз Балтыйскае мора). Але «Газпром» абвяргае гэтую вэрсію.

## Апека для «Менсккомплексбанку»

**«Менсккомплексбанкам» з 1 верасьня будзе кіраваць часовая адміністрацыя Нацбанку.** Сам банк ня можа ажыцьцяўляць бягучыя плацяжы, не выконвае абавязковых эканамічных нарматываў, працуе стратна. Часовая адміністрацыя за тры месяцы выправіць становішча. На гэты час прыпыненая праца з крэдыторамі і паўнамоцтвы выканаўчых органаў «Комплексу». У астатнім банк будзе працаваць у звычайным рэжыме.

## Эўраінфляцыя

**Інфляцыя ў зоне эўра (на аснове зьвестак зь Нямеччыны і Італіі) павялічылася ў жніўні на 2,1%** у параўнаньні з аналягічным леташнім пэрыядам. Чакаўся рост інфляцыі толькі на 2,0%. У ліпені рост складаў 1,9%. Францыя ж не вытрымлівае дазволенага для зоны эўра 3-працэнтнага дэфіцыту бюджэту. Эўра як скокнуў вышэй даляра, так можа і ўпасьці.

## Швэды перад рэфэрэндумам

**47% апытаных швэдаў супраць замены кроны на эўра. «За» — 39%.** Урад пераконвае, што ўваход у зону эўра паскорыць эканамічны рост і паспрые разьвіцьцю рынку працы. Праціўнікі даводзяць, што беспрацоўных у Швэцыі толькі 5% (у зоне эўра ўдвая болей), а тэмпы эканамічнага росту дастатковыя. Рэфэрэндум па эўра адбудзецца 14 верасьня.

## На мабільніках не заробіш

**Попыт на сотавыя тэлефоны вырасьце сёлета на 10%, вытворцы ва ўсім сьвеце прададуць 450 млн мабільнікаў, прагназуюць экспэрты кампаніі «Siemens».** Сам канцэрн прадасьць да канца верасьня 39 млн мабільнікаў (на 15—20% больш, чым летась). Рост продажаў не пацягне за сабой падвышэньня прыбыткаў: цэнавая канкурэнцыя ў гэтай галіне велізарная.

**СП; БелаПАН, «Национальная экономическая газета»**

## Пікет у падтрымку чачэнцаў

**Кіраўнік незарэгістраванай Беларускай партыі свабоды Сяржук Высоцкі падаў у Менгарвыканкам заяву.** Ён просіць дазволу на пікет, які мае адбыцца 8 верасьня ад 12 да 13-й насупраць расейскага пасольства. Пратэставаць зьбіраюцца супраць генацыду чачэнскага народу і расейскіх спробаў інкарпараваць Беларусь. Заяўленыя лёзунгі — «Войскі ААН — замест расейскіх» ды інш.

**БТ**

## Зварот сайту www.charter97.org да грамадзкасьці

Наш сайт некамэрцыйны. Рэсурсы, якія мы мелі, вычарпаліся. Тэхніка псуецца. Каб сайт працаваў, патрэбныя сродкі для аплаты арэнды памяшканьня, тэлефоннай сувязі, Інтэрнэту, арэнды сэрвэру і перакладу матэрыялаў. Патрэбная таксама дапамога ў тэхнічным забесьпячэньні. Улічваючы катастрафічнасьць становішча, мы вымушаныя пайсьці на крайнюю меру і зьвяртаемся да вас па дапамогу. Нам патрэбная ваша падтрымка. Вольнае слова павінна жыць у беларускім Інтэрнэце!

Усе, хто гатовы дапамагчы, зьвяртайцеся на электронны адрас help@charter97.org

# Лявон Баршчэўскі

Працяг са старонкі 1.

**«НН»: А на міжнародным узроўні?**

**Л.Б.:** Сёньня нашых літаратараў на Захадзе амаль ня ведаюць. Я прыкладу ўсе намаганьні і скарыстаю асабістыя сувязі, каб зьмяніць сытуацыю ў лепшы бок.

**«НН»: Якія Вы маеце прапановы па ўшанаваньні памяці Васіля Быкава?**

**Л.Б.:** Улады дзікім дэкрэтам забаранілі грамадзкім арганізацыям ужываць тэрмін «прэзыдэнт». Але ёсьць і станоўчы момант. Будзе сымбалічна, што Васіль Быкаў будзе адзіным прэзыдэнтам у гісторыі ПЭН-цэнтру. Бо замяніць яго немагчыма.

Разьлічваць на спрыяньне ўлады ў справе ўшанаваньня нерэальна. Трэба ініцыятыва грамадзтва. Можна было б выпусьціць кнігу твораў Быкава ў якасным, сучасным выданьні. Варта надаць больш увагі апошнім творам, якія мала друкаваліся.

Калі будзе створаны Беларускі нацыянальны ўнівэрсытэт, ён мог бы насіць імя Быкава. Гэта быў чалавек інтэлектуальнай эліты, і толькі інтэлектуальныя цэнтры вартыя насіць яго імя. Як і вуліцы ды плошчы, але не на ўскрайках, а ў цэнтры Менску, Полацку, Горадні. Рада будзе рабіць захады ў гэтай справе, праўда, без асаблівай надзеі на існую ўладу. Сапраўднае ўшанаваньне Быкава адбудзецца толькі ў свабоднай Беларусі.

**Запісаў Алег Тачоны**

# Карткавы бунт у БДУ

**У Белдзяржунівэрсытэце зь першых дзён навучаньня студэнтам пачалі выдаваць электронныя студэнцкія білеты. За два тыдні іх мусяць атрымаць 17 тыс. чалавек. Студэнты зьбіраюцца пратэставаць.**

Новыя дакумэнты каштуюць 17 тыс. рублёў. Хто не заплаціць — не атрымае. Нават пяцікурсьнікаў прымушаюць рабіць сабе плястыкавыя карткі. Старыя білеты, паводле словаў Валянціна Зубовіча, загадчыка аддзелу ў цэнтры інфармацыйных тэхналёгіяў БДУ, «ужо ня дзейнічаюць». Выходзіць, унівэрсытэт прымусова зьбірае не такія ўжо і малыя грошы з сваіх студэнтаў.

У БДУ зьявіліся ўлёткі супраць «новых аўсвайсаў», падпісаныя «Камітэтам за студэнцкае самакіраваньне» і «Беларускім сацыяльным рухам «Разам». Многія адмаўляюцца здаваць грошы і выконваць напаўтурэмную працэдуру атрыманьня білета — у актавай залі з аховай на ўваходзе іх фатаграфуюць, подпіс «алічбоўваюць», правяраюць асабістыя зьвесткі.

Новы білет не намакае, яго складана падрабіць. Мікрачып утрымлівае інфармацыю аб уладальніку квітка і можа выкарыстоўвацца для аўтарызацыі доступу ў інфармацыйную сетку ВНУ ды Інтэрнэт. Новыя дакумэнты дапамогуць весьці электронныя бібліятэчныя фармуляры; удасканаліць прапускную сыстэму ў інтэрнатах, навучальных карпусах і лябараторыях; наладзіць экспрэс-кантроль наведвальнасьці заняткаў і рэйтынгавую сыстэму ацэнкі ведаў.

Два апошнія пункты студэнтам асабліва недаспадобы. «Унівэрсытэцкаму кіраўніцтву важныя не фактычныя дасягненьні ў вучобе, а колькасьць часу, праседжанага ў аўдыторыі», — кажуць яны. «Паставяць турнікеты на ўваходах і будуць аўтаматызавана сачыць, хто дзе знаходзіцца». Сярод студэнцтва ходзяць чуткі, што «пажарнае» ўвядзеньне новых білетаў ладзіцца з ініцыятывы пэўных фірмаў, якія спрабуюць зарабіць на мадэрнізацыі.

Упершыню за колькі гадоў унівэрсытэт прачнуўся. Студэнты раяцца, абураюцца, друкуюць улёткі і арганізуюцца. У сераду ўвечары адбылася першая акцыя пратэсту.

**СР, АТ**



# Забыты звон манэтаў

promenade

**Украіна напярэдадні свайго Дня Незалежнасьці сустрэла мяне маляўнічымі вёсачкамі, што літаральна патанаюць у зеляніне садоў. Акуратныя цагляныя дамоўкі, дагледжаныя з эўрапейскай рупнасьцю, аніяк не стасуюцца з вусьціішнымі паведамленьнямі пра жахлівае ўкраінскае жыцьцё. Хаця, як высьветлілася, жыцьцё ва ўкраінскай вёсцы зусім ня соладка. Калгасы разваліліся, палеткі зелянеюць пераважна ад пустазельля. У той жа час харчовы крызыс, якім нас палохаюць падчас штогадовае «бітвы за ўраджай», Украіне не пагражае: хлеб і гароднiна ёсьць у кожнай краме.**


IREX-PROMEDIA

Майдан Незалежнасьці

## Мэтро і маршруткі

Муніцыпальны транспарт у Кіеве не карыстаецца асаблівою папулярнасьцю. За выняткам мэтро. Перад нудным чаканьнем на прыпынках кіеўцы аддаюць перавагу маршрутным таксоўкам. Балазе кошты квіткоў у дзяржаўным і прыватным транспарце мала розьняцца. У сярэднім капеек на дзесяць (рублёў сорак нашымі грашыма). Гарадзкімі аўтобусамі карыстаюцца пераважна пэнсіянэры, бо маюць права бясплатнага праезду. Таму нярэдка можна пачуць ад кіроўцаў: «Возім адных смаржкоў!»

Калі ў вагоне менскае падзямкі пануе сапраўднае соннае царства, якое час ад часу парушаецца абвяшчэньнем станцыяў, то ў кіеўскім мэтрапалітэне сумна ніколі ня будзе. Амаль на кожнай станцыі нехта ўваходзіць і прапаноўвае нешта набыць: ад шарыкавых асадак да лейкапластыраў. Або яшчэ весялей: у вагоне зьяўляюцца два маладзёны з гітараю ды флейтаю й сэнтымэнтальнымі мэлёдыямі праганяюць сум, зьбіраючы з пасажыраў дробныя манэты. Словам, кожны зарабляе як можа. А калі музыкаў раптам не аказалася, то можна проста разглядаць рэклямныя абвесткі, якімі густа-густа аблеплены вагон. Як падалося, акрамя мяне іх ніхто і не чытаў.

## Помнік Быкаву

Сярод мноства раскіданых па Кіеве манумэнтаў, ад 62-мэтровай статуі на Майдане Незалежнасьці да больш дробных выяваў казакоў з шаблямі, дзідамі й конямі, можна адмысловa вылучыць помнік Быкаву. Не, не Васілю. Леаніду. Савецкім кінагледачам ён больш за ўсё запомніўся па ролі Маэстра ў чорна-белай стужцы «Ў бой ідуць адны старыя». Кучаравы чалавек, што, усьміхаючыся, сузірае з высокае стромы панараму Кіева, сам нібыта сышоў з экрану — тыя ж капітанскія пагоны, пастамэнт у выглядзе кавалка фюзэляжу самалёта і знаёмы аптымістычны надпіс: «Будзем жыць!» Хаця Леаніда Быкава ня стала яшчэ за савецкім часам, помнік зьявіўся толькі гады два таму.

Украіна імкнецца рупліва захоўваць памяць пра сваіх выбітных асобаў. Свой помнік ужо мае Валеры Лабаноўскі, слынны трэнэр кіеўскага «Дынама». Футбольныя заўзятары пасьмейваліся зь ягонае звычкі хістацца ўзад і ўперад, седзячы на трэнэрскай лаўцы падчас матчу. Таму кіеўскія хлапчукі, ганяючы ў двары мяч, нават жартам казалі малым, якія прагнулі далучыцца да гульні: «Мы гуляем, а ты сядай на лаўку і хістайся — Лабаноўскім будзеш!» З гэтае адметнасьці й скарысталіся скульптары. Цяпер, наведаўшы стадыён «Дынама» імя Лабаноўскага, кожны можа пабачыць славутага трэнэра, які сядзіць нахіліўшыся, паводле сваёй звычкі, наперад.

Аглядаючы безьліч раскіданых па Кіеве помнікаў, я падсьвядома адчуваў, што не стае толькі мілай сэрцу кожнага савецкага чалавека выявы. Але хутка я ўздыхнуў з палёгкай: вось яна! Стаіць, горда падняўшы галаву і павярнуўшыся тварам да высокага, прыгожага будынку. Праўда, не ля Вярхоўнае Рады ці прэзыдэнцкае Адміністрацыі, але побач зь ня менш вядомай у Кіеве «ўстановай» — Бесарабскім рынкам. А вось «галоўнага» Леніна з Майдану Незалежнасьці даўно прыбралі.

## Каменныя арыстакраты

Андрэеўскі спуск. Вузенькая вулічка, якая, выгінаючыся, зьмейкаю спаўзае ўніз. Адзін з самых старых раёнаў Кіева. Архітэктурай нагадвае Траецкае перадмесьце. Большасьць старых дамоў старанна адрэстаўраваныя. Новыя дамы, што вырастаюць навокал, — гэта сапраўдныя каменныя арыстакраты, высілкамі архітэктараў стылізаваныя пад мінуўшчыну. Пройдзе некалькі гадоў — і наўрад ці можна будзе адрозьніць, дзе старая пабудова, а дзе сучасная.

На працягу блуканьняў па Кіеве мяне суправаджаў навязьлівы гук, ад якога беларусы даўно адвыклі, — звон манэтаў у кішэні. Гавораць, што менавіта наяўнасьць «жалеза» зьяўляецца прыкметаю жыцьцястойкасьці валюты. У гэтым ёсьць рацыя: курс грыўні адносна даляра за апошнія гады мала зьмяняўся. Кепска толькі, што купюры рознага наміналу маюць падобны колер — лёгка пераблытаць. Асабліва калі ўпершыню трымаеш гэтыя грошы ў руках.

Апошні дзень у Кіеве. А палове на шостую раніцы радыё, якое дагэтуль спакойна драмала, нічым не выдаючы сваёй прысутнасьці, раптам прачынаецца і, бадзёрым голасам абвесьціўшы дакладны час, сьпявае: «Ще не вмерла Україна…»

А ўжо праз некалькі гадзінаў аўтобус, пакідаючы ззаду мытны пункт, дзе на галоўным будынку было напісана «Україна», нёс мяне наперад, насустрач дарожнаму знаку «Республика Беларусь».

**Валянцін Бойка, Кіеў—Мазыр**

• НАВІНЫ •

## Шэварднадзэ сыходзіць

**Эдуард Шэварднадзэ не зьбіраецца трэці раз балятавацца на прэзыдэнта Грузіі.** Выступаючы на ТВ, Шэварднадзэ адзначыў, што «ў Грузіі нямала вартых палітыкаў, якія могуць прэтэндаваць на пасаду прэзыдэнта і ў выпадку перамогі ачоліць дзяржаву». Паўнамоцтвы 75-гадовага Шэварднадзэ сканчаюцца ў красавіку 2005-га. Ён двойчы абіраўся на прэзыдэнта — у 1995 і 2000 г. З 1992 да 1995-га быў «старшынём парлямэнту — кіраўніком дзяржавы».

## Пераемнік Азнара

**Калі гішпанскія правыя пераможуць на парлямэнцкіх выбарах, прэм'ерам стане Марыян Рахой.** Цяперашні прэм'ер Хасэ Марыя Азнар паведаміў, што ня пойдзе на трэці тэрмін. 48-гадовы Рахой — віцэ-прэм'ер ураду ад 2000 г., пяць разоў быў міністрам. Лічыцца цьвёрдым палітыкам, лібэралам у эканоміцы і прыхільнікам блізкасьці з ЗША. Пакуль у рэйтынгах правая Народная партыя ідзе папярод апазыцыйных сацыялістаў.

## Карэйцы хочуць працаваць

**Паўднёвакарэйскі парлямэнт пастанавіў зрабіць у суботу выходны.** Дагэтуль карэйцы працавалі 44 гадзіны ў тыдзень: пяць поўных дзён і ў суботу да абеду. Прафсаюзы пратэстуюць: скарачэньне адаб'еца на заробках.

**СМ**

# «Польшча — адвакатка Беларусі ў ЭЗ»

## Інтэрвію зь міністрам замежных справаў Польшчы Уладзімежам Цімашэвічам



**— Польшча ўводзіць візавы рэжым зь Беларусяй. Што Вы маглі б сказаць беларусам, каб яны не баяліся ўвядзеньня візаў?**

**Уладзімеж Цімашэвіч:** Пашырэньне Эўразьвязу — добрая навіна для ўсходніх суседзяў Польшчы. Прыгадайма час, калі Польшча задумалася наконт сваёй прыналежнасьці, свайго месца ў аб'яднанай Эўропе. Тады нам дапамагла Нямеччына. Добра мець суседа, які зьяўляецца членам Эўрапейскага Зьвязу. Які ня толькі разумее суседзяў, што застаюцца па-за саюзам, але й хоча ім дапамагчы. Мы ўжо давялі, што лічым менавіта так. У Эўропе ня можа быць падзелаў — вось асноўная ідэя выпрацаванай намі канцэпцыі будучай супольнай усходняй палітыкі ЭЗ. Трэба супрацоўнічаць і падтрымлівацъ усе дзеяньні, скіраваныя на ўсталяваньне дэмакратычнага ладу, на эканамічнае разьвіцьцё ўсходніх суседзяў Польшчы. Гэта доўгі й няпросты працэс, які можа даць пэўныя вынікі ў пэрспэктыве. Мо на гэта спатрэбіцца дзесяць гадоў. Тым ня менш, калі б я быў беларусам альбо ўкраінцам, я быў бы рады, што разам з далучэньнем Польшчы да ЭЗ атрымліваю адваката сваёй справы ў Эўразьвязе.

**— Якой мусіць быць роля Польшчы ў пашыраным Эўразьвязе? Якое месца яна зойме сярод краінаў, што ўжо зьяўляюцца чальцамі Зьвязу, і краінаў, якія далучацца ў 2004 г.? Ці Польшча будзе — і ці наагул яна мае такое жаданьне — уплываць на супольную ўсходнюю палітыку Эўразьвязу?**

**У.Ц.:** Гэта залежыць прынамсі ад двух істотных чыньнікаў. Па-першае, ад фармальнай пазыцыі Польшчы — а яна моцная. Ужо падчас саміту Зьвязу ў Ніцы было вырашана, што Польшча атрымала вялікае прадстаўніцтва ў Эўрапейскім Парлямэнце, шмат галасоў у Эўрапейскай Радзе. Нас запэўнівалі, што грамадзянін Польшчы (як і грамадзяне астатніх краінаў-кандыдатак) будзе мець права прэтэндаваць на пасаду аднаго зь зьвязаўскіх камісараў. Але другім, можа нават і важнейшым, фактарам зьяўляецца нашая актыўнасьць, нашая прафэсійнасьць.

**— Чым для Вас быў момант падпісаньня афінскага Трактату аб далучэньні Польшчы да Эўрапейскага Зьвязу? Ці толькі фармальнасьцю?**

**У.Ц.:** Гэта была вялікая ўрачыстасьць. Але й дыскусія пра будучыню Эўразьвязу, пасьля ўступнага слова Жыскар Д'Эстэна, была вельмі глыбокая й аргумэнтаваная. Сустрэча ў Атэнах ня сталася выключна фармальнай цырымоніяй.

**— Спадару міністар, на сёньняшні дзень пашырэньне Эўразьвязу мае больш палітычнае ці эканамічнае значэньне?**

**У.Ц.:** І палітычнае, і эканамічнае. Мы пашыраем супольны рынак, павялічваем шанцы на хутчэйшае эканамічнае разьвіцьцё Польшчы. Але адначасова мы ствараем групу з дваццаці пяці краінаў, якія жадаюць супрацоўнічаць у вырашэньні ня толькі эўрапейскіх, але і міжнародных пытаньняў, што тычацца эўрапейскага кантынэнту. Ужо адно гэта дае палітычнае вымярэньне пашырэньня Эўрапейскага Зьвязу. Я сказаў бы, што тое пашырэньне зьяўляецца самым складаным праектам у гісторыі міжнародных адносінаў. Ніколі не было структуры, якая арганізавала б настолькі маштабнае супрацоўніцтва такой вялікай колькасьці краінаў у такой колькасьці галінаў адначасова. У гісторыі не было яшчэ такой падзеі, і вельмі важна, што Польшча бярэ ў ёй удзел.

**— Якім чынам пашырэньне Эўрапейскага Зьвязу паўплывае на палякаў, што жывуць па-за межамі Польшчы, асабліва ў краінах, што ўвайшлі ў ЭЗ раней?**

**У.Ц.:** Перш за ўсё мы зблізімся — я маю на ўвазе палякаў у Польшчы й іх суродзічаў у Эўропе. Апрача таго, мы атрымаем больш магчымасьцей для абароны правоў палякаў там, дзе ў гэтым ёсьць патрэба. Несумненна, далучэньне Польшчы да Эўразьвязу зьяўляецца добрай навіной для палякаў па-за межамі краіны. Мы ўсе павінны задумацца, якім чынам палякі, расьсеяныя ня толькі па Эўропе, але й па ўсім сьвеце, змогуць адчуць далучэньне Польшчы да Эўразьвязу. Палякі, якія жывуць у краінах — суседках Эўразьвязу — я маю на ўвазе перш за ўсё Беларусь і Украіну, — адчуюць пашырэньне разам з актывізацыяй палітыкі пашыранага Зьвязу.

**Гутарыў Тамаш Саевіч**
**Беларуская служба радыё «Палёнія»**

# На вузкім ложку у беларускім інтэрнаце пад гучную музыку

Увесну, калі сонца прыпякае, але на вадасховішча ехаць яшчэ халодна, інтэрнацкія прыгажуні загараюць на падваконьнях. Кладуцца і выстаўляюць ногі ў расчыненыя вокны. Беларуская віягра. Хто раз пабачыць — ніколі не забудзе.

У студэнцкім інтэрнаце набываеш некалькі карысных звычак. Найперш — навык з камфортам спаць удваіх на вузкім ложку. Пасьля можна без праблемаў зьмяшчацца на нераскладзенай канапе ці вагоннай паліцы: яе галоўка на тваім плячы, ножка — закінутая на тваe, яе вольная рука на тваёй ключыцы, твая — песьціць ейны стан… Магчымыя варыяцыі.

Многія постстудэнцкія сем'і (а праз інтэрнаты прайшла палова эканамічна і сэксуальна актыўнага насельніцтва краіны) выносяць з інтэрнату звычку кахацца пад гучную музыку. Гэта прадыктавана адсутнасьцю гукаізаляцыі. Прычым музыка гэта бывае такая, якую ў спакойнай абстаноўцы каханкі нізавошта ня сталі б слухаць. А тут яны яе проста ня чуюць — як тубыльцы, што жывуць ля Ніягары, ня чуюць грукату вады. А вось да жыхароў суседніх пакояў інтэрнату і праз музыку даносяцца рыпеньне ложка ды жарсныя стогны мілосьнікаў.

Дарэчы, пра грукат вады. Душ — ці ня самая эрагенная зона інтэрнату, ідэальная схованка ад суседзяў.

Галоўная асаблівасьць сэксу ў беларускім інтэрнаце — імавернасьць таго, што ў пакой у любы момант могуць зайсьці. Ідэальна, калі маеш добрыя адносіны з суседзямі і можаш выправіць іх «папіць піва» на пару гадзінаў. Або калі вы вучыцеся ў розныя зьмены. Адны мае знаёмыя мелі будаўнічую шыльдачку «Асьцярожна, працуюць людзі», якую вешалі на дзьверы, калі раптам зьяўлялася хэнць.

Яшчэ ў пакой можа зайсьці які пільны адміністратар-вуаерыст. Звычайна гэта незамужняя жанчына бальзакаўскага веку з нэрвовымі рухамі і хімічнай завіўкай. Яна мае ключы ад усіх пакояў і «правярае атапленіе» ці «санітарнае састаяніе». Калі пасьпееш, налягай на дзьверы магутным плячом. А бывае і наадварот: пасьля бурхлівых любошчаў каханкі высьвятляюць, што ўвесь гэты час дзьверы былі незамкнёныя. Прымыкаюць і зь ціхім сьмехам валяцца на ложак.

Самае эратычнае сьвята ў беларускім інтэрнаце — стары Новы год, калі ўсе абліваюць адно аднаго вадою. Сяброўка — з асаблівай стараннасьцю: іх смочкі так і пукацяцца пад мокрай саколкай, што ліпне да маладога гарачага цела.

На кожным паверсе ёсьць напаўзацемненая рэкрэацыя — «цалавальнік». Тут адбываюцца сур'ёзныя размовы, прызнаньні, тут абвяшчаюць пра «я болей цябе не люблю», раўнуюць, мірацца і, вядома ж, мілуюцца.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



Пэтынг — без праблемаў. Увогуле ж, кахаюцца ў інтэрнаце ўсюды: на страсе пад зорамі, на гарышчы, на чорнай лесьвіцы, на балконе, у супольнай кухні між плітамі ноччу, у рэпэтыцыйным пакоі знаёмых рокераў, дзе абавязкова ёсьць ложак. Хіба толькі не ў прыбіральні. Прынамсі, я пра такія выпадкі ня чуў.

Але нават калі вы адны ў пакоі, калі ведаеце, што ніхто вам не перашкодзіць, пільнасьці губляць ня варта. Вось адзін мой знаёмец вырашыў зрабіць у любошчах перапынак ды выйшаў з пакою «папудрыць насок». Была ноч, ён не апранаўся. Вярнуўшыся, пабачыў замкнёныя дзьверы. Пастукаў. Сяброўка не рэагавала. Голы чалавек у пустым калідоры біўся аб тыя дзьверы, крычаў, ныў і прасіўся. Урэшце з маху высадзіў іх нагою. На пытаньне, чаму не адчыняла, партнэрка адказала: «А я думала, гэта ня ты…»

Надвячоркам да інтэрнату (асабліва калі там жывуць незьлічоныя студэнткі гуманітарных спэцыяльнасьцяў) зьяжджаюцца рознакалібравыя аўто. Спыняюцца воддаль (каб канкурэнт не пацэліў з акна бутэлькай у лабавік) і пачынаюць натужна сыгналіць. Бо крычаць пад акном «Каця!» або «Сьвета!» немэтазгодна — адгукнецца дзясятак галасоў, пераважна мужчынскіх.

Калі ты ў інтэрнаце прыхадзень, твая галоўная праблема — час. Бо да 22.00 мусіш сысьці. Не пасьпееш — пакінуты ў вахцёра дакумэнт забярэ вячэрні камэндант, каб падчас абходу знайсьці цябе і перадаць опэратраду, які ўрачыста выведзе «парушальніка рэжыму» на вуліцу. А сяброўцы, да якой ты прыходзіў, дадуць адпрацоўку: прымусяць мыць падлогу ў калідоры. Такое вось водгульле родава-племяннога змаганьня за жанчынаў.

Калі папрэш на вахцёра ўнахабку — каб пусьцілі ў інтэрнат — можа спаткаць нечаканы аблом. Як таго здаровага п'янага бугая, якога зьбіў і здаў у міліцыю наш 65-гадовы М***ч, вэтэран нейкіх загадкавых спэцслужбаў. Дзед, дарэчы, выдатна гаворыць па-беларуску.

А можна ціхенька сунуць вахцёрцы шакалядку ды прайсьці, не пакідаючы дакумэнтаў. Але ня кожная возьме хабар — ёсьць прынцыповыя, баязьлівыя дый папросту свалачныя. Калі інтэрнат стары і вокны на першым паверсе незакратаваныя, усё вырашаецца проста. Стукаеш — адчыняюць — залазіш. У навейшыя інтэрнаты з цокальным паверхам лезуць па вадасьцёкавай трубе на казырок над дзьвярыма або па закратаваным бальконе чорнае лесьвіцы. Месца тое сапраўды чорнае: хлопцы зрываюцца ды забіваюцца.

Разумнейшыя або цьверазейшыя абіраюць мірны шлях змаганьня за сэрцы інтэрнацкіх сябровак. Узімку на сьнезе пад вокнамі зьяўляюцца вялізныя выптаптаныя надпісы: «Маша (Лена, Воля, Таня etc.), я цябе кахаю». Пасьля іх замятае завіруха, але ў адлігу яны праяўляюцца зноў і часам бываюць трывалейшымі за тое каханьне.

**Ігар Няхведараў**

## Большасьць беларусаў пачала сэксуальнае жыцьцё пазьней, чым гэта «прынята лічыць»

Калі ў Вас зьявіўся першы сэксуальны досьвед?* (%)

| | |
|---|---|
| Пакуль сэксуальнага досьведу ня маю | 5 |
| Да 12 гадоў | — |
| 12—14 гадоў | 2 |
| 15—16 гадоў | 13 |
| 17—18 гадоў | 23 |
| 19—20 гадоў | 27 |
| 21—25 гадоў | 16 |
| 26—30 гадоў | 4 |
| Пасьля 30 гадоў | 2 |
| Цяжка сказаць | 8 |

* На пытаньні адказвалі 600 менчукоў у веку 18 і болей гадоў

**Сацыялягічная служба «Люстэрка» агенцтва БелаПАН**

АПЫТАНЬНЕ «НН»

## Ці існуе беларуская эротыка?

**Упершыню гэтае пытаньне «НН» узьняла ў 1992 г. Тады пытаньне шакавала і ня менш шакавалі адказы. Сьцьверджаньне Зянона Пазьняка пра тое, што «ў нармальным грамадзтве эротыкі няма», цытавалася найчасьцей. Ці адбыліся зьмены ў сьвядомасьці беларусаў за адзінаццаць гадоў? Каб гэта высьветліць, «НН» зьвяртаецца да тых самых экспэртаў з тым самым пытаньнем.**

### Лекар-сэксапатоляг Зьміцер Капусьцін:

**2003:** А ці ёсьць яна ўвогуле? Пра якое нармальнае стаўленьне да эратычнай сфэры можна казаць, калі ў краіне толькі восем спэцыялістаў па палавых паталёгіях? А ў сьвеце, паводле статыстыкі, 10% мужчынаў маюць разнастайныя праблемы ў гэтай сфэры. І калі за год да спэцыялістаў зьвяртаюцца 5—6 тысячаў чалавек замест статыстычных 200—400 тысячаў — гэта ненармальна.

**1992:** Ніякай беларускай эротыкі цяпер не існуе. Ёсьць нейкія сацыяльныя і ўзроставыя групы, у якіх робіцца невядома што і што заўгодна. А ўсё таму, на мой погляд, што ў Беларусі няма ніводнага лекара-сэксоляга і ёсьць толькі 12 сэксапатолягаў. Ніхто не выхоўвае норму, і застаецца толькі лячыць адхіленьні.

### Скульптар Валяр'ян Янушкевіч:

**2003:** Вы ведаеце, каму тэлефануеце? Вельмі дзіўна, што вы зьвярнуліся з гэтым пытаньнем да мяне. Напэўна, вы мяне зь некім пераблыталі.

**1992:** Няўжо гэта самае актуальнае цяпер? Чаму ты не пытаешся, напрыклад, пра ўплыў рэлігіі на мэнтальнасьць беларусаў? Я б пачаў з гэтага… І чаму ты пытаешся ў мяне? Папытайся ў этнографаў. Я не ведаю, што табе адказаць.

### Гісторык і літаратар Віктар Чаропка:

**2003:** Якая эротыка?! У нас жа не Кітай! Глёбусу званіце, у яго пытайце. Альбо «Жаніцьбу Цярэшкі» чытайце — там уся эротыка.

**1992:** Беларусы ніколі не былі пурытанскай нацыяй. У нас, вядома, не існуе такой культуры эротыкі, як у Індыі, але нам трэба яе распрацоўваць, карыстаючыся і здабыткамі іншых нацыяў, і здабыткамі нашае культуры.

### Літаратар Максім Клімковіч:

**2003:** Беларуская эротыка вызначаецца падвышанай антысанітарыяй. Гэта можна заўважыць і з народных досьціпаў, і з нашай клясыкі. Памятаеце гэты вядомы коласаўскі верш, паводле якога «Песьняры» зрабілі песьню «Ганулька»? Там самы пяшчотны момант — «Анучы ў Нёман ты мыць паняслa». Ёсьць і другі бок — малпаваньне эўрапейскіх, амэрыканскіх узораў: рафінаваная эротыка, якая мае мала супольнага з нацыянальнымі падваліамі.

**1992:** Добрая зьвява ці благая — мы даведаемся са словаў, якімі яна пазначана ў нашай мове. Клясычны прыклад: любоў і каханьне, каханка й палюбоўніца. Адсутнасьць у беларускай мове брыдкай лаянкі, зьвязанай з сэксам, таксама сьведчыць на карысьць засваеньня эротыкі на ўзроўні культуры.

Працяг на старонцы 7.

Зьміцер Бартосік

# Немагчымае Варадэра

**«Какія красівые в Беларусії дзевушкі, — заўважыў неяк мой сябра, седзячы ў дарагой менскай рэстарацыі. — Красівыя, праўда, пакуль маўчаць. Але якія эканамічныя выгады марнуюцца! Быў бы наш беларускі Фідэль ня лох, зрабіў бы з Нарачы эўрапейскае Варадэра. Усе гэтыя «Зубронкі» ды санаторыі-прафілякторыі — нахер. Працоўныя масы — за калючы дрот, каб і духу іхнага быдлячага там не было. Панабудаваць гатэляў, казыно ды стрыптызаў. Абслугу завезьці зь якой Літвы ці Польшчы. І каб беларускі там прысутнічалі толькі ў адной катэгорыі. Ад сотні эўра і вышэй. Як бы расквітнеў край наш сінявокі! Якія б інвэстыцыі паліліся! Якая б эўраінтэграцыя закруцілася! Ды праз пару гадоў не пазналі б мы сваёй старонкі занядбанай…» Сябрукова думка мне збольшага спадабалася. Бо і сам я рэдка калі сустракаў у старонцы роднай афіцыянтак ці прадавачак. Бачыў толькі красівых «дзевушэк», якія строілі зь сябе афіцыянтак і прадавачак. І як толькі раскрывалі рот, жаданьне ў іх нешта набываць бясьследна зьнікала. «Вось што можна рабіць з гэтай фіфай? — не сунімаўся сябра, паказваючы на фанабэрыстую красуню за суседнім столікам. — Далучыць да адраджэньня роднай мовы? Прасякнуць ідэямі дэмакраты? Ты сам цудоўна ведаеш тое адзінае, што зь ёй можна і хочацца рабіць…»**



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

## Памэла Андэрсан за пяць баксаў

Але я ведаў даўно, што Беларусь наўрад ці калі-небудзь ператворыцца ў бардэль. Бо неаднойчы каштаваў пладоў мясцовага райскага дрэўца. Якое Варадэра! Я нават ня ўпэўнены, што беларуская сталіца калі-небудзь дасягне дзясятай долі варшаўскай раскамплексаванасьці. Не магу ўявіць абвесткі кшталту «Стань маім рабом» ці «Самыя шыкоўныя тайляндкі» ў «Минском курьере». Не ўяўляюцца часопісы «Экстаз» ці «Лег шоў», што мірна суседзяць зь «Белорусской нивой» ды «Народнай воляй» у шапіках «Белсаюздруку». І ўжо тым больш сумленьне адмаўляецца маляваць салён піп-шоў у раёне Кастрычніцкай плошчы ці вуліцы Камуністычнай. У цэнтры Варшавы тыя піп-шоў ледзь не на кожным рагу. Каштуе танец эратычны баксаў пяць. А расчараваньня — на ўсе дзесяць. Не забудуся на свой першы паход у гэтую мілую ўстанову. На сцэну, адгароджаную ад кабінкі люстраным шклом, выйшлі тры дзеўчыны гадоў па трыццаць дзевяць ды прапанавалі мне выбраць зь іх найпрыгажэйшую. Азадачаны гэткім рэбусам, я пагадзіўся на любую. Пасьля чага цэлых пяць хвілін назіраў за несамавітай задніцай, што круцілася за шклом, і думаў: калі ж гэтая казка скончыца? Ніводзін шалёны гармон так і не зайграў ад таго відовішча. «А што ты хацеў? — пасьміхаўся калега. — Думаў за пяць баксей убачыць голую Памэлу Андэрсан? Зазірнуў цёці ў дупу — і радуйся».

Іншая рэч — варшаўскі бардэль. Звычайна гэта дагледжаная кватэра, абклееная кідкімі шпалерамі. У рабочых пакоях, апроч мяккіх матрацаў, ёсьць яшчэ сінія лямпы, дзякуючы якім беласкурыя славянкі ператвараюцца ў смуглых лацінак. Кліента сустракуюць урачыста, з усьмешкамі, нібы дарагога госьця. У вітальню выходзіць уся брыгада «хуткай дапамогі». Дзеўкі на любы густ. У асноўным украінкі. Я замовіў самую экзатычную дзіву, на выгляд ці то румынку, ці то цыганку. Выявілася беларускай з Мастоў. І музыка была чароўная, і паветра араматызаванае, і дзяўчына пекная. Адчувай сябе Алі-Бабом ды насалоджвайся момантам. Але я быў абсалютна ніякі. Узгадаўся геніяльны Даўлатаў. «Ён у цябе ня проста ляжаў. Ён валяўся!» Асноўны інстынкт спасаваў перад нязвыклай атмасфэрай і адсутнасьцю перадгісторыі. Канчаткова ж дабіваў храномэтар. Якім усё ж трэба быць галодным самцом, каб аддавацца любошчам, трымаючы ў галаве, колькі там яшчэ засталося да сканчэньня чароўнага сэансу. І зразумеўшы, што сэксуальнага агрэсара ў бліжэйшыя паўгадзіны зь мяне не атрымаецца, рэшту свайго законнага часу я пусьціў на ўспаміны пра Бацькаўшчыну. Пасьля распавядаў сябруку, як я ў варшаўскім бардэлі вёў размовы пра Беларусь нашу мілую за свае крэўныя. «Вычварэньні бываюць розныя, — канстатаваў сябра, — але ты адмысловы гарэзьнік».

## Сэкс-канвэер

Уявіце сябе трыццацігадовую прасмаленую бл.дзішчу, якая корчыць зь сябе нецалаваную дзяўчынку. Такая асацыяцыя ў мяне з Масквой. Бо ні піп-шоў на вуліцах, ні рэклямы ў газэтах. Але зайдзі ў завулак, у закулісьсе… Дзясяткі элітных салёнаў, сотні індывідуалак з уласнымі інтэрнэт-сайтамі, тысячы радавых байцоў нябачнага фронту, што шыхтуюцца ў даўжэзныя шэрагі на адмысловых задворках. Нагадвае вялізны канвэер. Апынуўшыся ў расейскай сталіцы, залез у Сеціва, дзе ўбачыў амаль дзяўчыну сваёй мары. Мініятурную бляндыначку Ксюшу, якая, згодна з тэкстам на сайце, абяцала ўвасобіць у жыцьцё ўсе мае запаветныя мары ды фантазіі. З фантазіямі ў мяне праблем ніколі не было, і я за паўтары гадзіны да цягніка паехаў на мэтро «Каломенскую». У сьціплай і чыстай кватэрцы, дзе колішняя ніжагародзкая гімнастка жыла і працавала адна, я атрымаў цікавы і пазнавальны ўрок пра магчымасьці сэксу. Прынамсі, даведаўся, што такое сапраўдны мінэт. Прыемна зьдзівіла яшчэ тое, што грошы я плаціў пасьля акадэмічнай гадзіны. Так і ня ўцяміў — ці гэта правіла высакароднай Ксюшы, ці гэта мае чэсныя вочы так на яе падзейнічалі. Аднак прыемна было адчуць гонар за немэркантыльную Расею. Бо сярод прастытутак Менску нічога падобнага не сустракаў…

## Трохмэтроўка

Калі ж Вам закарціць прадажнага каханьня ў сталіцы краіны самых прыгожых жанчын, ні ў якім разе ня йдзеце на плошчу Перамогі. Дзе, як сьцьвярджаюць менскія старажылы, знаходзіцца стомэтроўка. Можа, яна там і знаходзілася ў якіх 50-х. Цяпер гэта трохмэтроўка ля выхаду з мэтро, там, дзе стаянка таксі. Пасьля адзінаццатай вечара на гэтым пятачку можна заўважыць зграйку далёка ня самых цнатлівых «дзевушэк». Вось толькі ня варта прасіць іх прадэманстраваць вабноты — паказаць захапляльную ножку ці бліснуць боскай грудкаю. У найлепшым выпадку німфы пашлюць вас на тры літары. З чаго можна зрабіць выснову — раманцічэскіе дзевушкі вышлі не на панэль, а на сьвіданіе з прынцамі. Акрамя белых коней у прынца павінна быць трыццаць баксаў, каб мець шчасьце цэлую гадзіну абшчацца з сваёй абраньніцай, а таксама замак, куды яе трэба тымі коньмі адвезьці. Па варшаўскіх ды маскоўскіх мерках гэты жывы тавар ня цягне і на пяцёрку. Але паколькі тыя вартавыя любові стаяць штоноч, і ў сьнег, і ў вецер, дык можна зрабіць выснову — зь белымі коньмі ў Менску ўсё ў парадку.

Ня раю таксама зазіраць на беларускія сайты для дарослых. Там нават дарослыя могуць напалохацца, што ўжо казаць пра непаўналетніх. Але, нягледзячы на такую, у параўнаньні з суседнімі мэгаполісамі, непрасунутасьць, ёсьць і ў нашай сталіцы свая разынка. Купеце газэту «Из рук в руки». Адкрыйце разьдзел «Знаёмствы» і чытайце яго, як кнігу пра любоў. Сюжэты дамалюе вашая фантазія. Колькі «чароўных», «стылёвых», «сінявокіх», «палкіх і пяшчотных» чакаюць Вас. Каб «разьвеяць самоту», «падзяліцца цеплынёй і пяшчотай» ды «падараваць райскія незабыўныя хвіліны асалоды». Расчараваньне будзе прапарцыйнае вашым фантазіям. Бо часьцей за ўсё замест уцялесьненай мары Вас чакае сустрэча ў раздаўбанай ды непрыбранай кватэры зь неахайнаю, мякка кажучы, непрыгажуняю. З жахам

Працяг на старонцы 13.

## 35% рызыкантаў, 48% асьцярожных

Вашае стаўленьне да сэксу з выпадковым знаёмцам*

| | |
|---|---|
| Гэта амаральна, я гэтым ніколі ня стаў бы займацца | 21 |
| Не асуджаю, але сам(а) не хацеў(ла) б гэтым займацца | 16 |
| Гэта небясьпечна, можна падхапіць СНІД | 11 |
| У мяне не было такой практыкі, але карціць паспрабаваць | 6 |
| Залежыць, што за чалавек | 21 |
| Пазытыўна, у мяне была такая практыка | 8 |
| Іншае | 3 |
| Цяжка сказаць | 13 |

* На пытаньні адказвалі 600 менчукоў у веку 18 і болей гадоў

**Сацыялягічная служба «Люстэрка» агенцтва БелаПАН**

# Сэкс у мове

Шмат у каго выраз «займацца каханьнем» выклікае абурэньне. Маўляў, займацца можна каратэ ці плаваньнем, але каханьне — вялікае сардэчнае пачуцьцё і г.д., і г.д. Тым ня менш, паўсюдна — і ў фільмах, і ў літаратуры — займаюцца менавіта «каханьнем». А чаму, скажам, ня сэксам? Бо апошняе нават сёньня для многіх гучыць замоцна.

Слова «сэкс» у нашай мове мае вузкае значэньне полавага акту. А ў ангельскай яно пазначае найперш полавую прыналежнасьць асобы. Часам гэта прыводзіць да кур'ёзных выпадкаў — да прыкладу, падчас запаўненьня анкеты ў графе «sex», замест «жанчына/мужчына», беларус можа напісаць «рэгулярна».

> Магчыма, словы «сэкс» і «секчы» (або «сякера») паходзяць з аднаго індаэўрапейскага кораню.

Слова «сэкс» у ангельскай фіксуецца з 1380 г. і паходзіць ад лацінскага «sexus» — пол. Магчыма, яно мае сувязь з «secare» — «падзяляць, разразаць», і, адпаведна, можна дапусьціць, што «сэкс» і «секчы» (або «сякера») — словы аднакарэнныя… Ідэя падзеленасьці сустракаецца і ў слове «пол» — індаэўрапейскі корань «pol» пазначае «падзяляць». Вось і выходзіць, што два розныя карані з блізкім значэньнем спараджаюць у розных мовах словы з адным і тым сэнсам.

Слова «сэкс» у значэньні «сэксуальныя зносіны» пачалі ўжываць каля 1929 г. (з падачы ангельскага пісьменьніка Дэвіда Лоўрэнза). Цікава, што ад назоўніка «сэкс» у беларускай мове не ўтвараецца адпаведны дзеяслоў. Вось і даводзіцца сэксам альбо «займацца», альбо яго «мець». Што ж тычыцца «каханьня», то ў некаторых выпадках яно проста замяняе слова «сэкс», бо занадта ж моцна апошняе гучыць (для кагосьці нават цяпер).

Старажытныя паляўнічыя не прамаўлялі імя жывёлы, на якую ішлі, каб не сурочыць. Так зьявіліся словы-табу. У іх лік трапілі і словы, якія пазначалі зьявы і аб'екты, што лічыліся непрыстойнымі і саромнымі з пункту гледжаньня грамадзкай маралі. На іх месца прыйшлі эўфэмізмы і перыфразы. У студэнцкім асяродзьдзі ў першай палове 90-х для пазначэньня полавага акту ўжываліся словы «тузацца» альбо «суполіцца». Але яны так і не прыжыліся. Замацаваліся словы «трахацца», «перапіхвацца», «церціся», што нарадзіліся ў расейскім слэнгу. Зрэшты, кожная пара называе гэта па-свойму.

Найбольшыя моўныя пошукі ў гэтай сфэры ў працах пурыста Янкі Станкевіча сустракаюцца ў назвах полавых органаў: жаночы ён называе «пяцелька», а мужчынскі — «посік». Вячаслаў Адамчык ужываў слова «струк», на Валожыншчыне ў гэтым значэньні кажуць «кіла», а творы Адама Глёбуса поўняцца «чэлесамі».

У беларускай мове ўсе паняткі, якія абазначаюць гэтае дзеяньне, пераважна пераносныя, вобразныя. Ёсьць слова «гу́каць», якое апісвае полавы акт між япруком і сьвіньнёй, але таксама ўжываюць яго і да людзей. У дачыненьні да бараноў і авечак карыстаюцца словам «міркітавацца/міркатавацца», і да людзей — таксама. Янка Золак (Антон Даніловіч) у 1983 г. у Саўт-Рывэры выдаў у 11 асобніках «Слоўнічак пазаслоўнікавых слоў». Аматарам раім пачытаць.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Вольга Гапеева, Аркадзь Шанскі**




IREX-PROMEDIA

# Sex: рэвалюцыя не адбылася

Па вяртаньні ў Беларусь, нават і ня з самых далёкіх падарожжаў, міжволі ловіш сябе на думцы, што трапіў у край, дзе сэксу няма. Спачатку трапляецца адмыслова несэксуальная рэкляма, як для дзяцей ці пэнсіянэраў. Хоць да якіх пэнсіянэраў апэлюе расьцяжка церазь Нямігу «Суши с лососем. От 8000!», сказаць цяжка. Нават рэкляму касмэтыкі, бялізны ці спартовага інвэнтару ў Беларусі робяць адмыслова ніяк. Без эмоцый, без правакацый.

Пасьля зьвяртае на сябе ўвагу поўная адсутнасьць эратычнае паліграфпрадукцыі ў шапіках.

Нібы й не было ў Беларусі шумавінных віроў «перастройкі». А некалі можна было пабачыць па БТ фільмы Бэрталючы й Браса, набыць у «каапэратараў» гулецкія карты зь пікантнымі сюжэтамі, у «Крыніцы» ці ў «Чырвонай змене» зьдзівіцца са сьмеласьці фатографаў ды рэдактараў, узяць напракат любую «гарачую» відэастужку, жахлівае, праўда, якасьці, але так, для паўнаты ўяўленьня… Уяўлялася тады, што праз паўтара дзясятка гадоў гэта ўсё ўвойдзе ў звычаёвы побыт, толькі на куды вышэйшым узроўні. Але ўсё адбылося ня гэтак. Нібы ў кіно стужка закруцілася ў адваротны бок. Зьніклі эратычныя выданьні, кінасэансы для дарослых, артыкулы пра «гэта»… «Начныя матылькі» збольшага зьляцелі на сьвятло суседніх і далейшых сталіцаў. А мяркуючы па тутэйшых каналах тэлевізіі, зь Беларусі разьбегліся наагул прывабныя людзі абодвух полаў, пакінуўшы на экранах істотаў, якія міжсобку істотна ня розьняцца. На гэтым тле постаць першага й адзінага насамрэч выглядае яскрава.

Беларускае кіраўніцтва да такое ступені дапрыладжвалася пад электарат, што сьведамасна й інтэлектуальна зь ім зраслося. Асноўнай базаю рэжыму ёсьць пэнсіянэры й малакваліфікаваныя работнікі перадпэнсійнага веку, якія жывуць пераважна ў правінцыі. Ім насамрэч вярнулі куды болей, чым колішнія гербы-штандары-зоркі etc., — ім вярнулі атмасфэру іхнае анэмічнае старасьці. Нішто ў Беларусі не пакрыўдзіць іхных уяўленьняў пра жыцьцё — ані закароткая спаднічка сьпявачкі, ані хімічная завіўка футбаліста, ані запростая, як для кіраўніка, жонка. Іх, жанок ці сэкс-партнэрак, у кіраўніка на публіцы быць ня можа, блізка як у ксяндзоў. Так было ўсё мінулае стагодзьдзе, гэтак мусіць быць і надалей. Хто прыгадае жанок Машэрава, Кісялёва, Сьлюнькова? Не пасьпелі запомніцца й «другія паловы» кіраўніцтва незалежнае Беларусі. Што дае багатую спажыву для фантазіяў, напрыклад: абараваў ёй вушы, паламаў нос, забіў і зьеў… Аднак у сьвяце прапажы ў Беларусі людзей цікавасьць да лёсу жанок цяперашняга кіраўніцтва — не пустое блазнаваньне. Не да жартаў у такой сур'ёзнай краіне.

Самы прыкры факт зь нізкі прыкладаў, датычных несэксуальнасьці нашае краіны, — гэта не фатальная адсутнасьць сэкс-індустрыі як сэгмэнту законнай эканомікі (з бардэлямі, стрып-барамі ды сэкс-шопамі), а адсутнасьць нацыянальных сэкс-сымбаляў. Закаціліся валасатыя зоркі выканаўцаў зь ВІА, напамажаныя і льсьняныя зоркі тэлевядучых, зоркі красамоўных маладых палітыкаў з палымянымі вачыма, зоркі спартоўцаў, паэтаў, актораў. Сёньня без усьмешкі казаць пра беларускія сэкс-сымбалі немагчыма. Але пуставаць гэтыя месцы ў масавай сьвядомасьці ніколі ня будуць. Іх запоўняць зоркі чужыя. Ня буду пракрокам, сказаўшы, што гэта будуць зоркі з Расеі — для каго «Тату», для каго — Кабзон.

Хаця… Варыянт для беларускай зоркі можа быць такі: стаць Борам Майсеевым, пасуседзіць у Маскве па доме зь Цыцянковым, прыехаць на «базар» у Віцебск і трапна прамовіць з тузін беларускіх словаў на мясцовым тэлебачаньні. Талерантныя й лагодныя беларусы мусяць растаць сэрцам ля «блакітных» экранаў.

Беларусы нават ня ўзбіліся на стварэньне сваіх сэксуальных стэрэатыпаў. Ні за саветамі, ні пазьней справа далей за клішэ пра «сіняво касьць» не пайшла. Тым часам літоўцы, дзякуючы падтрымцы яшчэ Гарбачова, займелі свой нацыянальны «брэнд» — шыкоўны альбом шыкоўных ню «Кветкі ў кветках» фатографа Дзіхявічуса. Параўнаньне тут з Глёбусавым «Дамавікамэронам» будзе ня толькі некарэктным, але й вусьцішным.

Таму, міркітуючыся на свой лад, у чужой кватэры, сваім кабінэце ці на лаве гарадзкога парку, лепей ня згадваць пра сытуацыю ў краіне, дзе нішто не зьмянілася. Апроч моўнай, культурнай, мэнтальнай сытуацыяў, не зьмянілася й сытуацыя з сэксам. Прынамсі, ён застаўся. І ў некаторых рэгулярна.

**Гары Куманецкі**

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Ці існуе беларуская эротыка?

Працяг са старонкі 5.

### Зянон Пазьняк:

**2003:** Мы спрабавалі адшукаць сп.Зянона, каб атрымаць ад яго новы адказ, і ня здолелі. Вядома толькі, што ён у ЗША.

**1992:** У нармальным цывілізаваным грамадзтве ніякай эротыкі няма й быць ня можа. Вы ж паглядзіце на нашую патрыярхальную вёску. Мужчына з ранку працаваў у полі, потым прыходзіў дахаты, жонка яго карміла, разам выхоўвалі дзяцей. А ўначы яны займаліся натуральным працягам роду чалавечага. І ніякай эротыкі тут не прысутнічала. Нездарма наша Сьвятая Царква таксама адмаўляе ёй у існаваньні, бо ўсё гэта бесаўшчына і ад д'ябла.

### Журналіст Міхась Талочка:

**2003:** Давайце я на якое іншае пытаньне адкажу.

**1992:** Ніякай эротыкі ў нас не было, бо доўгі час мужчыны нават не здымалі кашулі, калі клаліся ў ложак разам з жонкай.

### Адам Глёбус:

**2003:** У нашым рэгіёне ўвогуле два самыя эратычныя народы — гэта мы і латышы. Увесь фальклёр насычаны эратычнымі матывамі. У расейцаў, напрыклад, няма такой мэтафарычнасьці, як у нас, — у іх усё груба, непрыстойна... У нас эротыка «талерантная», маем нават эратычнае сьвята Купальле. (Мы адзіная нацыя ў Эўропе, дзе эратычнае сьвята адзначалася на дзяржаўным узроўні. Такое ёсьць яшчэ хіба што ў якой Бразыліі.) У літоўцаў і палякаў — моцны ўплыў касьцёлу. З латышамі нашае Купальле і іхнае Ліго нас лучаць. Аднак у іх сьвята больш марское, прыбярэжнае, а ў нас — вада і лес, ды яшчэ моцны эратычны момант — пошук папараць-кветкі. Украіна... Вось паміж намі і Ўкраінай ляжыць «д'ябальскі» рэгіён — Палесьсе, адкуль ідзе вельмі вялікая эратычнасьць.

**1992:** Мне здаецца, што ў нас яна, ня ведаю, якое слова падабраць, больш грубая, ці што, чым у тых жа латышоў ці расейцаў. Бо мы больш за іх захавалі ў сабе рысаў ад часоў паганства.

Хто маўчаў пра эротыку ў 1992-м, маўчыць і цяпер. Але існаваньня эротыкі ніхто ўжо не адмаўляе. Пры гэтым колькасьць сэксапатолягаў у краіне зьнізілася з дванаццаці да васьмі.

**Апытваў Зьміцер Дзядзенка**

# Парфума з поту



Пах мужчынскага поту ўплывае на кабет мацней, чым найдаражэйшая парфума. Гэта высьветлілі навукоўцы Пэнсыльванскага ўнівэрсытэту. «Водар» мужчыны паляпшае самаадчуваньне жанчыны й нават можа прысьпешыць вылучэньне гармонаў плоднасьці. Так, паддосьледныя кабеты 25—45 гадоў, якія атрымлівалі экстракт мужчынскага поту, былі перакананыя, што навукоўцы праводзяць тэставаньне новай парфумы ці падаюць ім нейкі новы ачышчальны сродак з прыемным водарам. Галоўнае ў гэтай справе, каб мужчынскі пот быў сьвежы…

## 12 верасьня пятніца

**● БТ**

7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
7.10 «Алень і воўк». Мультфільм.
7.25, 15.35 Маст. фільм «Забойства бяз рызыкі».
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 «Малітва апошняй княгіні». Відэафільм.
11.15, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 18.10 «Будзем знаёмы». Сэрыял.
13.10 Маст. фільм «Закладніца».
14.40 «Масква — Менск».
15.15 «Лясныя падарожнікі». Мультфільм.
19.05 Мэлядрама «Паблізу ад раю».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Школа зласлоўя.
23.15 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».

**● СТВ**

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Менск і менчукі».
8.10, 23.05 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: драма «Гоншчык». ЗША, 2001.
10.15, 20.35 «Аўтапанарама».
10.30 «Тэатральныя гісторыі».
10.45 «Дыялёг з усім сьветам»: «Усё пра сабак. Бультэр'ер». Дак. фільм.
11.10, 12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.50, 18.40 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: дэтэктыў «Народжаная рэвалюцыяй».
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Загнаныя ў рай».
23.15 «Навіны СНД».
23.35 Кіно: баявік «Мастацтва вайны».

**● АНТ**

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.55 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.50 Сэрыял «Два лёсы».
10.40 Маст. фільм «Пётар Вялікі». Заключная сэрыя.
12.15 Сэрыял «Твінісы».
15.00 «Горад жанчын». Тэлевізійнае шоў.
15.45, 21.00 «Фабрыка зорак-3».
16.05 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Жарт за жартам».
18.50 «Поле цудаў».
20.00 Час.
22.20 Маст. фільм «Добры чалавек у Афрыцы». ЗША.
0.10 Трылер «Паляўнічы».

**● РТР**

7.45 Сэрыял «Каменская-2. Я памёр учора». 4-я сэрыя.
8.50 Пакой сьмеху.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 Бэнэфіс Клары Новікавай.

**● НТВ**

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Без рэцэпту».
10.05 Фактар страху.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно»».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 Нацыянальная бясьпека: закладнікі чорнага неба.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Маст. фільм «Тэкілавы сьвітанак».
22.25 Супэрбокс: Джуніёр Джонз супраць Эрыка Маралеса.

**● Культура**

15.00 «Плён асьветы». «Гутаркі аб расейскай культуры». Перадача 10-я.
15.40 «У пошуках Траянскай вайны». Дак. сэрыял. 4-я сэрыя. «Жанчыны Трої».
16.40 «Па кім званіў «Колокол»?» Дак. фільм. 2-я сэрыя.
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу». Настасься Госьцева.
17.55 «Майстар-кляса». Алена Абразцова, Рэната Скота, Іляна Катрубас.
18.35 «Тэатральны архіў». «Загадка Дзяніса Фанвізіна». Фільм 7-ы.
19.00 «Бінка». Мультсэрыял.
19.05 «Казка пра белую льдзінку». Мультфільм.
19.15 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя».
20.05 «Тры таполі на Плюшчысе». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.00 «Навіны культуры» з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».

**● Эўраспорт**

9.30 Гольф. US PGA. Спэцыяльны агляд.
10.30 Каноэ. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. ЗША.
12.00 Дзюдо. Чэмпіянат сьвету. Осака. Жывая трансьляцыя.
14.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Адборачны матч.
15.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 7-ы этап. Жывая трансьляцыя.
18.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Расея—Швайцарыя.
19.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Аўстралія.
20.30 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс.
21.30 «Формула». Аўтачасопіс.
22.15 Каноэ. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. США. Жывая трансьляцыя.
01.15 «Сэрыі». Аўтачасопіс.
01.45 Экстрэмальныя віды спорту.

## 13 верасьня субота

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.10 «Трышчан ды Іжота». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.45 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. Мэлядрама «Каханьне праз Інтэрнэт». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.30 «Сьпявай, душа!». «Скрыжаваньні».
12.15 «Турнір». Тэлегульня.
12.55 Тэлевізійны Дом кіно. Вынікі Адкрытага расейскага кінафэстывалю «Кінатаўр-2003».
13.20 «Тэатар. Выбранае». VIII Міжнародны фэстываль «Славянскія тэатральныя сустрэчы». Частка 2-я.
13.50 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
15.15 «Мой Менск. Настальгічнае падарожжа». Дак. фільм.
15.55 «Пайдзі туды — ня ведаю куды». Мультфільм.
16.50 Камэдыя «Гульня ў чатыры рукі».
18.25 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
18.50 Маст. фільм «Пяты элемэнт».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Маст. фільм «Спадарожнікі» (ЗША).
23.30 Канцэрт групы «Чычэрына».

**● СТВ**

7.30 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.45 Маст. фільм «Госьця з будучыні». 1-я сэрыя.
10.00, 19.55 «СТВ-спорт».
10.10 «Рэактыўны бокс».
10.30 Дак. фільм «Мы будуем храм».
11.05 «Анфас».
11.20 «Разам».
11.55 «Партрэт у інтэр'еры».
12.10, 20.10 «Мэдыкі». Тэлесэрыял.
13.05 Кіно: камэдыя «Бацькі й дзяды».
14.55 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.00 «Клясыка гумару».
17.00 «Галерэя. Мастак Леанід Шчамялёў».
17.30 Кіно: маст. фільм «Капітан».
19.30 «24 гадзіны».
21.15 Кіно: баявік «Рэйд адплаты».
23.00 «Навіны СНД».
23.20 «Арт-хаўз»: сатырычныя навэлы «Апавядальнік».

**● АНТ**

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20, 11.45 «Ералаш».
8.30 Грай, гармонік любы!
9.05 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Гафт па імені Аляўцін».
11.15 «Падарожжы натураліста».
12.10 Маст. фільм «Да зямлі і назад».
13.05 Дак. фільм «Кацярына III». Дак. фільм. Частка 2-я — «Начальніца культуры».
13.55 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.20 Тайны стагодзьдзя. «Тытанік. Расейская вэрсія».
15.00 Маст. фільм «Вяртаньне рэзыдэнта».
17.35 Прэм'ера. «Сант'яга. Чылі. Праз трыццаць гадоў».
18.20 «Сьмешныя людзі».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
21.55 «Залаты грамафон».
22.55 Трылер «Шакал».
01.00 «Ціхі дом».

**● РТР**

9.05 «Не сумуй!».
10.00 Сам сабе рэжысэр.
11.00 «Круты маршрут».
12.00 У пошуках прыгод.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Мачаха».
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Спартак» (Масква) — «Тарпэда» (Масква). Жывая трансьляцыя са стадыёну «Лужнікі».
17.00 Пакой сьмеху.
18.00 «Другая палова». Супэр-шоў.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Маст. фільм «Анёлы Чарлі».
22.25 Маст. фільм «Чырвоная сырэна».

**● НТВ**

9.05 Кулінарны паядынак.
9.55 Кватэрнае пытаньне.
10.50 Спорт «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 «Дзікі сьвет».
12.00 Уручэньне прэміі імя Арцёма Баравіка.
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: пастка». Частка 1-я.
17.05 Зусім сакрэтна.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Маст. фільм «Кацька і Шыз».
20.55 Маст. фільм «Бязь літасьці» (ЗША).
23.05 Начныя музы.

**● Культура**

11.25 ГЭГ.
11.40 «Сіняя птушка». Маст. фільм.
13.15 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя».
13.45 «Партытуры не гараць».
14.10 «Кіно, якое было». «Ільля Авэрбах. Прызнаньне ў каханьні».
14.50 «Чужыя лісты». Маст. фільм.
16.25 «Падарожжа з Эванам Макгрэгарам, якое нельга купіць». Дак. фільм.
17.15 «Магія кіно».
17.40 «Рамантыка рамансу».
18.20 «Сфэры».
19.00 «Шапка». Маст. фільм.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Птушкі нашай маладосьці». Спэктакль Малога тэатру.
23.30 Р.Шуман. Канцэрт для віялянчэлі з аркестрам.

**● Эўраспорт**

9.30 Футбол. Кубак Данон.
10.00, 14.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Адборачныя матчы.
12.00 Дзюдо. Чэмпіянат сьвету. Осака. Жывая трансьляцыя.
15.45, 18.15, 20.45 Матагонкі. Жывая трансьляцыя.
16.00 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 8-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Лёгкая атлетыка. Манака.
21.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Мужчыны. Нямеччына. Жывая трансьляцыя.
23.00 Экстрэмальныя віды спорту.
23.45 Каноэ. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. ЗША. Жывая трансьляцыя.
01.45 Формула-3000. Монц.

## 14 верасьня нядзеля

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.10 «Трышчан ды Іжота». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Слова мітрапаліта Філарэта на сьвята Царкоўнага навалецьця.
9.10 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. Мэлядрама «Каханьне праз Інтэрнэт». 2-я сэрыя.
10.45 Атрымай новыя мільёны з «Gallina Blanca».
10.50 Наша спадчына. «Палацава-паркавы ансамбаль у Жамыслаўлі».
11.05 Сад мары.
11.30 Асноўная вэрсія. «Крыж Эўфрасіньні Полацкай». Частка 2-я.
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 Сэрыял «Містэр Бін». Заключная сэрыя.
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
15.15 КВК. 1/3 фіналу Эўралігі.
16.50 «Краіна Аркестрыя». Мультфільм.
17.05 Маст. фільм «Бясконцая гісторыя».
18.35 «Сьвята ў Полацку». Відэафільм.
19.20 Мэлядрама «Павадыр» («Беларусьфільм»).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 «Маскі-шоў».
22.40 Футбол. Чэмпіянат Італіі. 2-і тур. «Мілян» — «Балоньня». Трансьляцыя з Італіі.

**● СТВ**

7.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.50 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.15 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.35 Маст. фільм «Госьця з будучыні». 2-я сэрыя.
9.45 «СТВ-спорт».
10.00, 20.10 «Аўтапанарама».
10.20 Дак. фільм «Менск, мая сталіца».
10.40 «Віват, Акадэмія!». Дак. фільм.
10.50 «Менск і менчукі».
11.00 «Сьвецкая хроніка».
11.10 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.25 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.35 «Філярманічны тыдзень».
11.40 «Плянэта людзей».
11.55, 21.30 «Мэдыкі». Тэлесэрыял.
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Кіно: драма «Вернемся ўвосень».
15.10 «Дружная сямейка».
16.20, 17.25 «Галоўныя ролі». Тэлесэрыял.
18.25 «168 гадзін».
19.10 «Залатая дзясятка Беларускай опэры. «Хаваншчына».
19.40 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.30 «24 гадзіны».
20.50 «Асабісты інтэрас».
22.25 Кіно: баявік «Паветраны паляўнічы».
0.00 «Навіны СНД».
0.20 Кіно: камэдыя «Таксіст і сьпявачка».

**● АНТ**

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.10 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 «Дачнікі».
12.10 Дог-шоў.
12.55 Сьмехапанарама.
13.25 «Клюб падарожнікаў».
14.00 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.30 Ток-шоў «Выбар».
15.15 Недапечаны Кінг-Конг у маст. фільме «Магутны Джо Янг».
17.00 Жывая прырода. «Монстры».
17.55 «КВК-2003».
20.30 Контуры.
21.15 Баявік «Шукальнікі згубленага каўчэга».
23.10 Маст. фільм «Вяртаньне ў блакітную затоку».

**● РТР**

9.05 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго».
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Брэнда Стар».
15.15 «Форт Баярд».
16.55 Маст. фільм «Устаяць немагчыма».
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Маст. фільм «Аварыя» (ЗША). 1997.
22.25 Трылер «Клетка».
0.15 Чэмпіянат сьвету ў аўтагонках сэрыі «Формула-1». Гран-пры Італіі. Трансьляцыя з Монцы.

**● НТВ**

9.05 «Расьлінныя жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.15 «Апэльсынавы сок».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.10 Усё адразу!
12.05 Камэдыя «Фантамас разбушаваўся».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Іх норавы».
16.10 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: пастка». Частка 2-я.
17.15 Злачынства ў стылі «Мадэрн»: палянэз вакол Агінскага.
17.50 Маст. фільм «Танцуй са мной».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фактар страху.

**● Культура**

10.15 «Ваш сын і брат». Маст. фільм.
11.45 Нядоўгія гісторыі.
12.00 «Леў з краіны Оз». Мультфільм.
13.15 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя».
13.45 Ізноў кружэлка сьпявае.
14.10 «Астравы».
14.55 «У сьвеце танцу». Балет «Карсар».
16.45 «Брыдкае качаня». Мультфільм.
17.10 «Забытая вайна». Дак. фільм.
18.15 Сьмеханастальгія.
18.45 «Рычард III». Маст. фільм.
21.00 «Больш чым каханьне».
21.45 «Культ кіно». «Прасьвятленьне». Маст. фільм (Францыя, 2001).
23.25 Джэм-5.

**● Эўраспорт**

9.30, 11.45, 15.45 Матагонкі. Майстры матагонак на трываласьць. Бальдэор — Залатая чаша. Жывая трансьляцыя.
10.30, 21.30 Каноэ. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. ЗША.
12.00 Дзюдо. Чэмпіянат сьвету. Осака. Жывая трансьляцыя.
14.30, 18.15 Лёгкая атлетыка. Манака.
16.15 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 9-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.30 Пляжны валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Мужчыны. Фінал. Нямеччына. Жывая трансьляцыя.
22.30 Каноэ. Чэмпіянат сьвету. Спрынт. ЗША. Жывая трансьляцыя.
0.45 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Рычманд.
01.45 Аўтагонкі сэрыі Індыкар. Джоліет.

# Сьвята «Крамбамбулі» крочыць па краіне

**З надыходам восені музыкі актывізавалі свае дзеяньні.** Вольскі і К°, напрыклад, у найбліжэйшы тыдзень дадуць аж тры канцэрты. Самымі першымі новы альбом «Крамбамбулі» ўжывую пачуюць жыхары Смалявіч. Тут **6 верасьня** адбудзецца сьвята гораду і на галоўнай плошчы цэлы дзень будуць граць розныя музыкі. Вольскі выступіць на адной сцэне зь Фінбергам.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Такая сабе міні-прэзэнтацыя «Крамбамбулі» заплянаваная на **9 верасьня ў клюбе «Графіці»** (пачатак а 20.00). Арганізатары абяцаюць вясёлую кумыс-вечарыну (у бары можна будзе пакаштаваць адпаведны напой). Што праўда, абодва тыя канцэрты пройдуць безь Сяргея Міхалка, пасьпяваюць толькі Вольскі з Кулінковічам. Лідэр групы «Ляпіс Трубяцкой» возьме ўдзел у вялікай прэзэнтацыі альбому **12 кастрычніка ў КЗ «Менск».**

**14 верасьня**, у свой дзень народзінаў, Вольскі разам з «NRM» дае акустычны канцэрт у палацы культуры «Сукно» (ст.м.«Пушкінская», вул. Матусевіча, 20). Грацца будзе найлепшае — ад песень часоў «Мроі» да самых новых. Не забудуцца музыкі і на песьні з супольных праектаў. Пачатак а 18-й. Уваход 6—10 тыс. руб.

**Сяргей Будкін**

Вольга Караткевіч

# Вялікі ложак Эўропы



## Сэксуальнае жыцьцё Прагі вачыма замежніка

КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

«Ангельская журналістка прыехала ў Нью-Ёрк. Яна была прывабная, дасьціпная і адразу пазналася з адным тыповым нью-ёрскім рэспэктабэльным нежанем. Яны цалаваліся, абдымаліся, пасьля ён паказаў ёй дом, які будуе. Яна параіла архітэктару перабудаваць другі паверх, каб дзеці не зваліліся... Яна чакала, што рэспэктабэльны нежань прапануе ёй шлюб. Пасьля гэтага ён, здаецца, патэлефанаваў ёй усяго разы два. Яна не зразумела, што адбылося, бо сустрэча з архітэктарам нешта ды азначае. Тады стала ясна: яна зь Лёндану. Ніхто не сказаў ёй пра Канец каханьня на Мангэтане. Значыць, яна павінна навучыцца».

Цяжка паверыць, што зь Лёндану магла прыехаць такая наіўная журналістка, але розьнасьць культураў ва ўспрыманьні сэксуальных дачыненьняў цалкам можа быць. Пачатак кнігі Кандас Бушнэл «Сэкс і горад», паводле якой зьняты знакаміты сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе», укладаецца ў мае назіраньні за тым, як сутыкаюцца розныя культурныя падыходы да сэксуальнасьці і сэксуальных дачыненьняў хоць бы і ў той жа Празе.

Сэксу хочуць усе. Але каханьня — ня менш. У рытме сучаснага гораду на каханьне застаецца мала часу, а каханьне ж яго вельмі патрабуе. Таму гэта вельмі каштоўная катэгорыя. Каханьне ў пераважнай большасьці выпадкаў прыводзіць чалавека да сэксу, а вось сэкс да каханьня — вельмі рэдка. Магчымасьці выбару, як заўсёды, яго вельмі ўскладняюць. Маю на ўвазе выбар.

На разьвітальнай вечарыне ў Беларускай асацыяцыі журналістаў з нагоды майго ад'езду на працу ў Прагу калега сказаў прыкладна так: ну, шкада, што зьяжджаеш, але вось табе нашае заданьне — знайсьці ў Празе свайго прынца. Сказаў пяшчотна, бяз жартаў. Запатрабаваў адразу паведаміць, калі гэта здарыцца...

### Сэкс-шопы

Калі я першы раз выклікала таксоўку на праскім чыгуначным вакзале, апэратарка адразу скіравала мяне да сэкс-шопу і паясьніла да якога. Бо звычайная стаянка запоўненая, як і ў Менску, таксістамі, што хапаюць тых, хто толькі прыехаў, і вязуць за кошты, зусім не адпаведныя выдаткам. Прыйшлося высьвятляць, дзе сэкс-шоп, стаяць ля яго, а пасьля ў таксоўцы разглядаць рэклямныя ўлёткі з аголенымі жанчынамі, якія (улёткі, а не жанчыны) удзень не здымаюцца. Насупраць касьцёлу, што на плошчы Міру, таксама сэкс-шоп. Прычым у месцы, якое ніяк не абмінуць, — там скрыжаваньне вуліцаў. Сваю рэклямную прадукцыю праскім сэкс-шопам нават удаецца падкінуць пад дзьверы, разам з улёткамі вялікіх супэрмаркетаў, дзе паведамляецца пра распродажы. На прадукцыю сэкс-шопаў, відаць, распродажаў няма. Такім чынам, слова «сэкс» у праскай прасторы прысутнічае паўсюль.

Калі я запыталася ў знаёмых: «Вас не бянтэжыць, што няма нейкай лякалізацыі гэтага бізнэсу?» — пачула абсалютна слушнае: што ты перайmаешся? Ня трэба — не заходзь, не зьвяртай увагі! Але зьвяртаецца. І ў гэтым — дасягненьне чэскага падыходу да сэкс-індустрыі.

### Вулічная эротыка

Гарачым летам Вацлаўскі пляц ператвараецца ў пляж. Прыгожыя чэскія дзяўчаты апранутыя так, аж часам здаецца, што падглядаеш. А можа, і падглядаеш, калі заўважаеш. Але пазайздросьціш дакладна: сама так ня можаш... Гэтым летам ужо хадзілі ў бюстгальтарах — ад купальнікаў ці спэцыяльна пашытых у кра-мах кшталту «Terranova». Вацлаўскі пляц і колькасьць напаўаголеных прыгажунь — сапраўды ўнікальная зьява, дакладна кажу. Дадам, што прыгажуні тут па баках не азіраюцца. Неяк я сядзела ў адкрытай рэстарацыі і назірала, як проста каля ходніка ўладкаваліся некалькі мусульманскіх сем'яў, прычым на месцы дысьляякацыі настойвалі мужчыны, жанчынам хацелася ў цянёк. Не — там не спрачаюцца. Дык вось, гаспадары сядзелі нібы паралізаваныя. Побач насіліся чарнявенькія дзеткі, мамкі іх супакойвалі, а кока-кола гаспадароў сямействаў доўга заставалася некранутай. Яны былі зачараваныя. Ня ведаю, што ім больш будзе прыгадвацца ў іх арабскім сьвеце, — Карлаў мост, Арлой, Вышаград, Градчаны ці плынь прываблівых целаў. Хаця, магчыма, і адно, і другое, бо на Градчаны праскія дзяўчаты таксама ж ходзяць.

Адзін знаёмы расказаў гісторыю: «Іду па Вацлавяку — падлятае мужчына, відаць, турак, і так хутка па-нямецку гаворыць: разумееце, хм, як Вам сказаць, ну Вы ж разумееце... Карацей, дзе тут найлепей і найбліжэй пабавіць час. Вы разумееце, што я маю на ўвазе». Ня ведаю, ці разгубіўся ў адказе мой знаёмец, але адназначы, што турак выглядаў, нібыта ў яго дзірка паміж самалётамі шэсьць гадзінаў і ён прыляцеў з аэрапорту на таксоўцы, каб... Я думаю, той проста ўжо ня вытрымаў, нагуляўшыся за дзень па Празе, якая прыгожая ўсім.

### Стрыптыз

Пры ўваходзе на Старамескі пляц — стрыптыз-бар. Калі прайсьці далей — яшчэ адзін. А ўздоўж усіх вуліцаў, незалежна зь якога боку йсьці на галоўны пляц Прагі, — прастытуткі. Неяк з адной беларускай кампаніяй мы прабіраліся ўвечары, каб паглядзець помнік Яну Гусу, што на Старамескай. І калі ўжо амаль дабраліся, я запыталася — можа, у стрыптыз-бар зойдзем? Цікава ўсё ж... Не, адказалі мне, лепш мы ўжо самі, надзетыя... Не выключаю, што паасобку пайшлі б.

У Празе безьліч бараў, дыскатэкаў, гей-клюбаў, дзе распранаюцца і адмыслова прыходзяць, каб пазнаёміцца для далейшых сэксуальных стасункаў. Ёсьць танныя, ёсьць элітныя. За рогам майго дому — звычайная дыскатэка, у якую ходзяць толькі чэхі. Я часам ваджу сваіх гасьцей туды, каб яны ня думалі, што Прага — гэта набор элітарных установаў для забаваў, а таксама каб пабачылі, зь якой асалодай і імпэтам 35—40-гадовыя чэшкі і чэхі танчаць, знаёмяцца, цалуюцца, цІскаюцца. Як калісьці ў савецкіх рэстаранах. Толькі больш раскавана.

### Сэкс-турызм

Прага перапоўненая турыстамі-мужчынамі з Заходняй Эўропы, якія прыяжджаюць па таньнейшыя, чымся ў іх краінах, паслугі, — сыпяшаюцца, пакуль Эўропа да канца не аб'ядналася. Паводзяцца часта нахабна, асабліва маладзёны зь Нямеччыны, Брытаніі, Аўстрыі. Я неаднаразова назірала, як брутальна яны абыходзяцца зь дзяўчатамі, брудна жартуюць, чапляюцца, насьміхаюцца, любяць вывучанае слова «курва». У сваіх краінах яны больш утаймаваныя.

Неяк мой сябра, пасьля сумеснага наведаньня самай вялікай дыскатэкі ў Празе — «Карлавы лазьні» (там сапраўды былі лазьні, яны і цяпер засталіся, толькі пар выдзяляюць наведнікі — і сухі, і мокры) — чатыры паверхі, дзе грымяць рознастылёвая музыка, дзе ў праходах стаіць ці ляжыць шмат абкуранай моладзі, — сказаў: «Прага — гэта вялікі ложак Эўропы».

Ніколі не ўгадаеш, што твой патэнцыйны «прынц» у гэтым вялікім ложку можа вырабіць. І ўцякаеш у свой маленькі, хатні.

*Прага*

## ТЫ СКАЗАЎ МНЕ «ДАРУЙ І БЫВАЙ»

### Каханкі Змагара



Былы слуцкі паўстанец Алесь Змагар пра сваіх шматлікіх каханак расказаў у лістах Янку Золаку. Ён згадаў чатыры дзясяткі жанчынаў (памятаў іх імёны, прозьвішчы, даты). Калі ў 1917—50-х гэта былі пераважна беларускі, дык у далейшым — кубінкі, японкі, гватэмалкі, гандураскі (адна зь іх стала яго жонкай), нікарагуанка, гішпанка, турчанка, харватка, сальвадорка, пэруанка, карэянка, мэксыканка... Сваіх каханак Змагар вучыў гаварыць і сьпяваць па-беларуску. Жанчыны ўздымалі яму настрой і «ўлівалі натхненьне да далейшай творчай працы» (Змагар шмат пісаў, праўда, мастацкая вартасьць ягонага даробку невялікая). У сакавіку 1986-га Змагар прызнаваўся Янку Золаку, што думае ажаніцца. «Тады і нацыянальная праца пойдзе спарней. Цяпер жа калі я што-небудзь цікавае і напішу, то пад уплывам якое-небудзь каханкі... Бязь іх жа няма ахвоты ня толькі пісаць, але й жыць». Было ў гэты час Змагару 83 гады.

### Ад Палуты — праз акно

Дзеячы БНР таксама былі не каменныя. Савецкі пісьменьнік Ільля Гурскі ў адным з сваіх твораў вывеў няшчаснае каханьне Палуты Бадуновай да Тамаша Грыба. Са зьдзекам ён пісаў, як Грыб уцякаў ад Бадуновай праз акно...



Палута Бадунова



Тамаш Грыб

Вядомая гісторыя дыпкур'еркі БНР Аўгіньні Аляксюк, якая тварыла цуды, пасьпяхова пера-адольваючы лініі франтоў і выконваючы важныя заданьні. Многія зьвярталі на дзяўчыну ўвагу, сам прэм'ер Антон Луцкевіч адзначаў яе энэргію і задор. А вось Янка Чарапук быў чамусьці пакрыўджаны на Аўгіньню, таму й пакінуў для гісторыі такую характарыстыку: «...панна Алексючанка з афіцэрамі ўсіх рангаў і нацыяў спагулівае, а ўрад ёй плаціць заробак».

### Між камуністам і нацыяналістам

Зоя Каўшанка падчас вучобы ў Віленскай беларускай гімназіі сябравала з вучнямі Язэпам Урбановічам і Міхасём Вітушкам. У часе вайны першы яе кавалер арганізоўваў у Заходняй Беларусі прасавецкае антыфашысцкае падпольле і партызанку, другі ж кіраваў антысавецкім падпольлем і партызанкай. Урбановіч загінуў у ліпені 44-га, лёс Вітушкі невядомы. Зоя ж апынулася ў ГУЛАГу, пасьля вызваленьня жыла ў Вільні, выйшла замуж. Адзінае, што засталося ў яе ад былых кавалераў-партызанаў, — фатаздымкі...



Міхась Вітушка



Язэп Урбановіч



Зоя Каўшанка

### Прынада для штабсляйтэра

На пачатку нямецкай акупацыі польскае падпольле накіравала прыгожых дзяўчат-полек працаваць перакладчыцамі і сакратаркамі ў нямецкіх начальнікаў. Празь іх вабноты здабывалася важная інфармацыя, лабіяваліся польскія інтарэсы. Бывала, што і беларускі нацыянальны рух карыстаўся гэтым прыёмам.

У Навагрудку беларускі дзяяч Барыс Рагуля здабыў прыхільнасьць і падтрымку штабсляйтэра Вальфмаера з дапамогай перакладчыцы Зіны Кунцэвіч. У гэтую прыгожую і адукаваную жанчыну, выпускніцу Віленскай беларускай гімназіі, закахаўся ня толькі Вальфмаер — па ёй «сохлі» ўсе «рагулёўцы». Польскі ўплыў у Навагрудку быў зьведзены да мінімуму. У 1942-м штабсляйтэра забілі партызаны, а Кунцэвіч пераехала ў Польшчу, дзе жыла пад іншым прозьвішчам.

**Падрыхтаваў СЁ**

# Сэкс-інструктары

**Ці рыхтуюць у гэтай краіне гігантаў, маньякаў і простых спажывальнікаў сэксу, тых, хто ў хуткім часе зможа вырашыць ня толькі дэмаграфічную праблему, але і праблему крэатуры ў Беларусі? Хто гэта робіць найбольш заўважна і прафэсійна, якія пэрсоны ўзяліся за нялёгкую місію публічных сэкс-інструктараў? Беларускія сэкс-ідалы паводле часопісу «Студэнцкая думка».**

## Вадзім Касалапаў
### вакаліст групы «NEO»



Адна з самых рэальных кандыдатураў на тытул «экс-партнай» поп-зоркі Беларусі. Прынамсі, цяпер «NEO» выглядае больш упэўнена за астатнія «маладыя» каманды. Франтмэн, вакаліст і аўтар тэкстаў Касалапаў — адзін з найбуйнейшых козыраў гурту.

Да «пісаных прыгажуноў» Вадзіка не аднясеш, але нязломнае пачуцьцё гумару разам з тактам, небанальны інтэлект і ўменьне падабраць ключ да любой, самай закавырыстай дзявочай душы робяць яго адной з самых прывабных асобаў беларускага шоў-бізу. Цалаваньне і пэтынг мікрафоннай стойкі, якія падмацоўваюцца чэрававяшчаньнем гіту «Эва» ў стылі «ката цягнучага», заводзяць самых халодных дамаў. Гледзячы на яго, дзяўчыначкі-нэаманкі вераць у тое, што сэкс — штука ня толькі модная і прыемная, але і вясёлая, раскаваная ды карысная для здароўя. Касалапаў тым часам элегантна працягвае…

У «NEO» прысутнічае яшчэ адзін сэкс-інструктар — гітарыст Андрэй Маркуц, які ў свае зусім ня 23 выглядае і паводзіць сябе на ўсе 23. Але трагедыя яго жыцьця — прыроджаная маўклівасьць на сцэне (бэкі ня лічацца). Хаця на такіх «маркуцаў» вядуцца самыя вытанчаныя і патрабавальныя фэміны «за 25».

**Стыль:** Дамскі Ўгоднік.
**З кім параўнаць:** з Элвісам. З гэтым пагодзяцца ўсе, хто бачыў Вадзіма на сцэне.
**Чаму вучыць:** ненавязліваму і вясёламу спакушэньню.

## Тамара Лісіцкая
### Ды-джэй «Альфа-радыё», вядучая БТ

Тамары, уладальніцы аксамітнага голасу, магічна-заклікальнага позірку зялёных вачэй і раскошных формаў, не прывыкаць да тытулу сэкс-зоркі. Яшчэ на пачатку 1990-х яе імя было ахутана легендамі. Цяпер гэтая жанчына — у росквіце ўсіх сваіх талентаў, яна цьвёрда ведае, што можа і чаго менавіта хоча. Часта балянсуючы ў сваіх тэле- і радыёэтэрах на мяжы кічу, Тома ніколі не зрывалася ў пошласьць, і нават калі па яе твары часам прабягала стома, яна выглядала смутна-эратычна.

Мара самавітых мужчын, якія слухаюць этэр «Альфы» ў ноч зь пятніцы на суботу і задуменна п'юць каньяк пад БТ у ноч зь серады на чацьвер.

**Стыль:** тыгрыца на паляваньні.
**З кім параўнаць:** прынцыпова непараўнальная.
**Чаму вучыць:** хто патрапіў, я не вінаватая.

## Люся
### Ві-джэй Першага музычнага каналу



Люся толькі пачынае кар'еру сэкс-інструктара. Але дзяўчына яна дасьведчаная. Гэта можа сказаць любы больш-менш мужчына, які толькі кіне позірк на Люсіны вусны і прывабны роцік.

Забойча дакладна выбрала патрэбны народу імідж капрызьлівай і зьдзіўленай німфы зь велічэзнымі вачыма, у якіх штурхаюцца махровая распуста і наіўнасьць дзевяцікляснікі. Зрэшты, сапраўдныя дзевяцікляснікі проста шалеюць, калі бачаць Lucy на экране. Пра гэта яны не забываюцца паведаміць такім жа малалеткам у «піпл-чаце», на форуме сайту 1М і ў школьнай прыбіральні, дзе ўжо пасьля трэцяга пачка L&M разьвітваюцца з бляскам гідрапіраваных валасоў, белымі зубамі і добрымі манерамі like a virgin назаўжды.

Калі 1М уключаюць хлопчыкі з простых сем'яў, дык яны вучацца на Люсіным прыкладзе зносінам (ва ўсіх сэнсах гэтага слова) з такім распаўсюджаным цяпер тыпам жанчын.

…А цалкам можа быць, што і мастурбуюць, — мы ня ў курсе.

**Стыль:** я пакуль яшчэ дзяўчынка.
**З кім параўнаць:** Твігі.
**Чаму вучыць:** усё ж такі цікавае яно, жыцьцё неразбэшчанай дзяўчынкі, ці ня праўда?



## Элеанора Язерская
### Экс-тэлевядучая

Занядбаная гаротнай доляй былая зорка БТ, затурканы пэрсанаж дохлых сьвецкіх кронік, які вымушаны быў сысьці ў самотнае апазіцыйнае падпольле.

Паводле вэрсіі самой Язерскай, яна знаёмая Віталя Вульфа і іншых прадстаўнікоў недакранальнай багемнай касты. Усё жыцьцё прагнула быць яе часткай, але насамрэч заўсёды заставалася ядравай квінтэсэнцыяй пошласьці, невыноснага псэўдагусту і «калгаснага» кічу, што парадаксальным чынам давала ёй права звацца «нацыянальным здабыткам».

У палюбоўніках у яе хадзіў сьпявак Віталь Жукофф. Цётак за пяцьдзясят звычайна цягне да маладых, але нешта ў іх там ня склалася.

Вамп-жанчына з настаўніцкімі схільнасьцямі: менавіта да такіх дамаў у салёны ў пазамінулым стагодзьдзі прасунутыя інтэлігенты-бацькі адпраўлялі сваіх сыноў, каб тыя пазбаўляліся цнатлівасьці ў заўсёды пяшчотных і гарачых абдымках.



**Стыль:** паляўнічая на нявінных.
**З кім параўнаць:** мадам Грыцацуева. Наглядчыца зь мюзыклу «Чыкага».
**Чаму вучыць:** цётачкі таксама хочуць.

## Ганна Шадрына
### журналістка

«Залатое пяро» «Советской Белоруссии», вядучая тэлевізійнай праграмы «Школа зласлоўя» на Першым нацыянальным. Мясцовая сэкс-бомба з прэтэнзіяй на багемны злом усіх маральных бар'ераў ня толькі ў журналістыцы, але і ў сэксе — калі ўжо і групавуха, і аднаполы лаў — норма і амаль не правакацыя.

У адным са сваіх артыкулаў нейк прызналася, што абедае ў цэнтры Менску і штодня сустракае то немца, то ангельца. Гэта пакідае ў паненкі адчуваньне, што жыве яна ў цывілізаванай эўрапейскай краіне. (Дзякуй Богу, хоць у кагосьці ёсьць гэтае адчуваньне.) Фатальная прыгажунька, цацанка не для ўсіх. Адно што нейк губляецца на фоне больш самаўпэўненай і на людзях архіэкзальтаванай кампаньёнкі Вікі Паповай. Хаця і ў Ані пантоў вышэй даху.

Вочы карычневыя. Спрабуе размаўляць з маскоўскім акцэнтам, але ўдаецца не заўсёды.

…Так і бачу сьвінцовыя ноздры спадарыні Ш., пад завязку забітыя какаінам, яна аж енчыць, седзячы верхам на якім-кольвек прадстаўніку арабскага ці скандынаўскага сьвету. Але, на жаль, вядома, што Шадрына тусавалася са звычайным апэратарам з БТ. Якія ж тут вам скандынавы! Патрыётка «самая настаяшчая».

**Стыль:** take me, дзядзя вунь з таго «пэжо».
**З кім параўнаць:** пасталелая Лаліта, недасьпелая Стоўн з «Асноўнага інстынкту».
**Чаму вучыць:** лёгка разьвітацца з грашыма.

## Дзіма Шэпелеў
### Ды-джэй, вядучы Першага нацыянальнага



Нішу маладзенькіх сэкс-ікон можа запоўніць сабой Дзіма Шэпелеў. Вось хто ўжо выклікае эратычную прагу дзяўчат-падлеткаў і зайздрасьць аднагрупнікаў з журфаку!

Нахрад ці Шэпелеў ведае шмат позаў, яго канёк — кансэрватызм, пяшчота і чуласьць, а «Камасутру» цытуе выключна дзеля эфэктнай фразы перад чарговым гітом на «Альфе». Яго б голым на вокладку CD, але нашаму грамадзтву не патрэбны ня толькі Васіль Быкаў, але і сэкс-ідалы. Шэпелеў быў першым, хто ўзварушыў балота сваім не па-беларуску бадзёрым тварам і вэрбальнай эстэтыкай а-ля ранішняе шоў якой-кольвек пэрыфэрыйнай FM-станцыі. Спачатку ён кагосьці раздражняў, потым выклікаў зайздрасьць, што трансфармавалася ў дэманстратыўную абыякавасьць.

Цяпер Дзіма робіцца закладнікам іміджу «бадзёрага скаўцкага актывіста», некаторая колькасьць рамантычна-нэўрастэнічных фарбаў яму

# Рабі як мы, рабі з намі, рабі лепш за нас



не зашкодзіла б.

І ўсё ў яго будзе добра, калі прага да новых эмоцыяў і адчуваньняў ня зьверне шэпелеўскае лібіда, як гэта часта адбываецца ў разбэшчаным багемным асяродку, са сьлізкага гетэрасэксуальнага шляху!

**Стыль:** малады ды раньні.

**З кім параўнаць:** Камолаў.

**Чаму вучыць:** любіць беларускае.

### Уладзімер Някляеў

паэт

Як казаў Блок, сапраўдны паэт перш за ўсё палюбоўнік. Палюбоўнік у самым высокім сэнсе — часу, сусьвету, жанчыны.



АРЦЁМ ЛЯВА



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Нашыя паэты ў большасьці ціхія вычварэнцы — няголеныя і сьмярдзючыя. Выключэньні — Бураўкін з Барадуліным, якія ў свае немаладыя гады захавалі бадзёрасьць цела і духу.

Паэт Някляеў за пляшкай гарэлкі любіць узгадаць, як «трушчыў камсамолак» у камсамольскім жа юнацтве. У любой кампаніі, дзе ёсьць прыгожыя жанчыны, Някляеў сумаваць ня будзе. Інтэрвію са спадаром Уладзімерам для адной менскай журналісткі ледзь ня скончылася актам. Шкада, вядома, што журналістка была дасьведчаная і з добрай газэты…

Зьбег на чужыну ад лапаў рэжыму, каб ня страціць тонусу.

**Стыль:** спакушальнік стажорак зь філфаку.

**З кім параўнаць:** Сяргей Паратаў зь «Беспасажніцы» А.М.Астроўскага.

**Чаму вучыць:** усе мужыкі казлы, а паэты — казлы з крыламі.

### Сяргей Чэкерас

вядучы актор Нацыянальнага расейскага драматычнага тэатру імя Горкага

Ставячы пад сумнеў разнастайнасьць акторскай палітры Чэкераса, нельга не прызнаць яго моцнай эратычнай энэргіі, якая флюідамі дасылаецца са сцэны ў партэр цягам усяго спэктаклю. Дзеўкі бегаюць на яго па некалькі разоў, дзеўкі ад Чэкераса млеюць: «Гамлет», «Тата! Тата!», «Дзівакі» — там ён сьпявае, танчыць і размаўляе.

Чаму ён не зьбягае з кволага тэатру куды-небудзь па лепшую долю — невядома. Можа, статус маладога бацькі ўвёў Чэкераса ў стан унутранай гармоніі з самім сабой, сьветам і жыццёвымі абставінамі.

Новы твар Расейскага тэатру замест мастадонта Расьціслава Янкоўскага, які заўсёды вылучаўся добрай патэнцыяй на сцэне і па жыцьці, атрымліваецца прываблыным і жыццяздольным у межах агульнай мэгасэксуалізацыі культуры.

**Стыль:** певень зь яйцамі.

**З кім параўнаць:** Антоніё Бандэрас.

**Чаму вучыць:** тэатар — тэрыторыя сэксу.

**Валянцін Папяляеў, Вячаслаў Чэх**

Віктар ЖЫБУЛЬ



# Ахвяры Камасутры

паліндром

А палац, маскарад…
на андарак — самца лапа.
Міла галава панікне напавал —
утома…
А мо, тулава паненкі — напавал,
агалім?
Іван, баб абнаві!
Кінь лапу, кум, у купальнік!
Ух, у запазуху!
На Тані — Натан,
на Машы — шаман
(баран-аматар, эратаман-араб),
на Марце — мастак-кат самец
Раман.
Макар Зіну — уніз, ракам.
Камасутра — гарт у самак!

Ала німб абмінала,
Ала пахіла на ліха пала:
Камасутра — жарт у самак.
Ала хакаса кахала,
а ня Яна.

Але села
Ала
сама да мас,
але цаляла гаманой —
о, нам агаляла цела!
Пупок! О, пупок! О, пуп!
А попа, а попа!
Ала,
ты — попыт!
Ала ж раз заржала:
— Юнага даганю!
Ясю аддаюся
за так — бы рыбка!
— Таз
і клубы — бы булкі!
Ала хаму махала,
ікнула, цап! — і пацалункі:
Ала валацугу цалавала.
— Ха-ха-ха! Хачу на анучах!
Ах!.. Ах!.. Ах!..
Агалім матор Эрота мілага!
Ат, упала шалец, ці вабіць,
ці бавіць цела шалапута.
Ух, і цапала паціху!
Ала васпана псавала.
Ала паціху пуп ух, і цапала!
— Ала, ты заказытала!
Які на табе батанік я!
Ткну палец у цела пункт!
Ала маладога таго даламала:
Ала дала.
Але цана цела —
раба, хама хабар.
А дар — дзіця ці здрада.

А дужа жуда
жарэ. Шукай акушэра ж!
Ала ж да рані нараджала.
І на — кесарава! «Масу самавара»
секані!
І лямант: «О, вы ж жывот намялі!» —
Нараджала ж да ран!
Конусы смокча рачком сысунок.
Ала дзіцё цёці здала.
Алу чакала талака, чула
кара: кумок Алу кулаком — у
карак!
Ала варагавала, галадала, галава
гаравала.
Алу Ніка пакінула.
Ала да папа падала.
Ала вяла манаха намалявала.
Урок… Адна… Маркоты вырак —
раман дакору.
Камасутра — зара мар азарту
самак…

# Немагчымае Варадэра

Працяг са старонкі 6.

выскачыўшы на менскую вуліцу, дзе ходзяць натоўпы сапраўдных прыгажуняў, вы надоўга згубіце ахвоту пакаштаваць мясцовага каханьня на продаж. Асабліва калі вашая фантазія сягае далей за місіянэрскую позу. Большасьць дзяўчатак з газэты наўрад ці ацэняць той стары расейскі анэкдот: «Вы пакутуеце ад сэксуальных вычварэньняў?» — «Што Вы, доктар! Я імі захапляюся!» Не шукайце ў газэце рабыню, з уладаркамі ў нас таксама напруга, а слова «фэтыш» нашым гетэрам увогуле невядомае. Але ў гэтым і ёсьць менская разынка. Словы пра пяшчоту і самоту — часьцей за ўсё праўда.

### Самаахвярная прастытуцыя

У Менску, па вялікім рахунку, амаль няма прастытутак. Я сустрэў сапраўдную толькі аднойчы. Сядзелі неяк з калегам у рэстаране гатэлю «Беларусь» і нечым прыцягнулі ўвагу даўганогай, пародзістай сукі. «Ну што, мінчане і госьці сталіцы, сумуем? Як наконт разнастаіць культурную праграму?» — «Разумееце, — пажартаваў сябрук, зьбянтэжыўшы мяне, — нам вельмі добра адзін з адным. І нават Вы ня здольныя перашкодзіць нашаму каханьню». — «Ну чаму ж? — не разгубілася дзяўчынка. — За пару гадзінаў я б выправіла вам абодвум згубленую арыентацыю». — «І колькі каштуе курс лячэньня?» — пацікавіўся я. «За сто у.а. вылечу». Такая сапраўды вылечыла б.

Але гэта выключэньне. А зазвычай найлепшае, што Вас чакае, — сустрэча з правінцыйнай студэнткай альбо маці-адзіночкай. І адны, і другія выклікаюць у мяне вялікую павагу. Бо ім не патрэбныя хлусьлівыя словы пра каханьне і дурное мужчынскае фанфаронства. І шмат каго зь іх я ўзгадваю з самымі сьветлымі пачуцьцямі.

Можа, мне шанцавала? Але тыя «чырвоныя каптуркі», што трапляліся на маім шляху, былі цалкам пазбаўленыя пошласьці, а некаторых я б назваў узорам маральнасьці. Пагадзецеся, калі вы прыходзіце ў бл.дзкі дом і бачыце разгорнуты нумар «Arche», прысьвечаны маэстра Глёбусу, дык міжволі задумаецеся пра маштабы беларусізацыі. А як забыцца на маладую маму, будучую настаўніцу біялёгіі, якая, каб прабіць дарогу да ведаў, авалодала навукай эратычнага масажу? Пасьля тых сэансаў я ня мог зразумець, навошта ёй біялёгія. А дзьве сястрычкі з далёкага райцэнтру? Яны некамэрцыйна прымалі ў сваім утульным салёне толькі тых, каго ўпадабалі. Аднойчы ў п'яным бяспамяцтве я прывалокся да іх сярод ночы бяз шэлега ў кішэні ды з поўнаю багацьця душой. Пасьля чаго быў адпоены гарбатаю ды пасаджаны ў выкліканую таксоўку. Многія з маіх сэкс-тэрапэўтак павыходзілі замуж. Чамусьці ўпэўнены, што ўдала. Бо гэтыя дамы столькі пабачылі нашага брата, што бязь цяжкасьцяў могуць адрозьніць юр ад пачуцьця.

Мой пераўтваральнік Нарачы сам, дарэчы, ніколі ня карыстаўся паслугамі прастытутак, хоць ягоная кішэня дазваляе скупіць ледзь ня ўсю паласу аб'яваў «Знаёмствы». «Можа б, я і трахнуў якую прыгажуню, — кажа ён, — але толькі калі б спачатку ўласнаручна памыў яе бэнзынам гадзіны тры і сам накачаўся антыбіётыкамі». Я зь ім ня згодны. Бо якую заразу лягчэй за ўсё падхапіць у калябагемнай каламуці. Дзе і жаданьні ніжэйшыя, і кошты вышэйшыя. І дзякуй Богу, што Варадэра ў нас немагчымае. Павінна ж быць у беларуса хоць адна радасьць. Самая красівая дзевушка ў сьвеце…

Адам Глёбус

# Sex, сымбаль і рух



Кожны імкнецца сам сабе выбраць шлях, працу і званьне. Я абраў літаратуру, мастацтва, культуру — супрацьстаяньне вайне. Стаў на бок каханьня, якое перамагае забойства. Як пісаў Бэрнз: «Зрабіць найлепей аднаго, чым пазьніштожыць многіх…»

Беларусь спакутавалася ад вайны і знакаў бяды. Сьвядомасьць беларусаў да краёў перапоўненая вайскоўшчынай, партызаншчынай, крывавымі і агністымі сымбалямі. Для мяне мілітарысцкае і міліцыянцкае знаходзіцца па-за этыкай, па-за эстэтычным. Апрыкла салдатчына праз сваю спрадвечную небеларушчыну, антыбеларушчыну і антычалавечнасьць наагул. Беларус — лірнік, пясьняр, лірык, каханак. Пісаць аповеды пра любоў, складаць інтымныя вершы, маляваць партрэты і паставы прывабных беларусак — маё. Тут і палягае канфлікт, бо пісакі ў пагонах, крытыкі ў ботах, маралісты з аўтаматамі пачынаюць крыць мяне матам, клікаць Бога ў сьведкі, плявузгаць у інфармацыйнай прасторы і бразгаць турэмнымі ключамі. Яны спрабуюць выклікаць мяне на дуэль. Я абяцаю прыйсьці і… не прыходжу. Паміж дуэльлю і спатканьнем я абіраю сустрэчу з жанчынаю. У мяне іншая мараль, іншыя каштоўнасьці і чалавечнасьць іншая. Людзкасьць люблю. Яна можа зьмяніцца ў адно імгненьне, і тады я разьдзяру зубамі горла любому дуэлянту, бо не прызнаю маральнасьці апасродкаванага забойства праз агняпальную зброю. Забойства — зло, бачыш ты ахвяру ці страляеш ракетаю па квадраце варожай зямлі, сутнасьць тая ж. Хопіць пра гестапаўцаў ад паэтыкі і палітыкі.



Я іду па праспэкце і ўсьміхаюся. Люблю гуляць вуліцамі і паркамі, сядзець у кавярнях і сквэрах, люблю алеі. Таму мяне ведаюць афіцыянткі, гандляркі газэтамі, прадавачкі кніжак і канцтавараў, прастытуткі і вулічныя вар'яткі. Люблю я рух жыцьця.

I like to move it! Move it!!! I like…

Горад мяне натхняе, дае мне хлеб духоўны. Каханьне на кожным кроку. Да мяне падыходзяць жанчыны… Да мяне чапляюцца жанчыны… Мяне жанчыны любяць. Таму я вельмі пераборлівы. Калі мне не падабаецца жанчына, калі яна дрэнна пахне, альбо ў яе нямытыя валасы, ці недагледжаная скура, ці нахабная інтанацыя, я адразу пераўвасабляюся ў лахаватага тыпуса, які па-народнаму адпрэчвае кралю. «Гуляй!» — кідаю ў жаночы твар. Атрымліваю назад нешта кепскае і маўчу. Цераз сваё нахабства ніхто не пераскоквае. Калі мне жанчына падабаецца, я запрашаю яе выпіць кавы. За гутаркай я разглядаю жанчыну больш уважліва. Магу прагаварыць з жанчынаю гадзіну, дзень, год, магу сем гадоў. Калі ёй спатрэбіцца каханьне, у мяне, як пішуць у газэтах, «ёсьць месца для сустрэчаў».

Бывае інакш. Прачынаюся і сам у сябе пытаюся: «Дзе гэта я? І што я тут раблю? І што гэта за жанчына побач сьпіць?» Шкадую, што маю памяць, якая вяртае малюнкі мінуўшчыны. Пілі, дадавалі, падлівалі. «Паехалі да дзевак!» Чамусьці дамаўляцца даводзіцца заўсёды мне. Бо хутчэй, бо да майго голасу ў слухаўцы ў жанчын узьнікае давер. Ехалася, перадамаўлялася, пілося, любілася, і абрубаўся я. Прахопліваўся пасярод ночы і «Дзе гэта я?» мяне цьверазіла. А які цудоўны мой горад Менск на золку. Ідзеш сабе, дыхаеш на поўныя грудзі, птушак слухаеш. Пасьля выпадковага каханьня мне хочацца слухаць сьпевы птушак.

Ну і жыў я сабе так. А Юра Цыбін зь Віталём Сямашкам прыдумалі для мяне званьне. На чарговай рок-каранацыі яны абвясьцілі мяне сэкс-сымбалем Беларусі. Гэтае абвяшчэньне паказалі па тэлеку. І пайшло-паехала, пакацілася, як кола з гары: «А што Вы думаеце пра сэкс? Як беларусы займаюцца сэксам? А як Вы ставіцеся да сэкрэвалюцыі?» За…-шыбісь!

I like to move it! Move it!!! I like…

Спачатку я думаў, што нікому такое званьне не спатрэбіцца. Памыляўся. У сэкс-сымбалі паперліся калегі па тры… пяру. Дзед Някляеў нарадзіў паэму, поўную мацюкоў. Гітарыст Чаропка выдрукаваў эратычны раманец. Паэт-барацьбіт Адамовіч апублікаваў лісты сваёй каханкі. Нават мёртвыя літгеніі паўсталі ў новых абліччах. Багдановіч з апісаньнямі стасункаў з чужой жонкаю Клаваю. Колас зь лістамі да палюбоўніцы. Але, але, але, але… Алена, жонка, мне дапамагла ўтрымацца на сэкс-Алімпе. Яна сфатаграфавала мяне з самымі прыгожымі жанчынамі Беларусі. А іх у жончынай фотастудыі заўсёды процьма. Там і Ліка Ялінская, і Тамара Ганчарова, і Кашыцкая, і Вольга, і Надзея, і Любоў…

Гэта пра перамогі, пра слодыч і ўзбуджанасьць распавядалася. Цяпер пра праблему. Мне трэба пераемнік. Дзе ўзяць? Спартоўцы і вайскоўцы адразу адмятаюцца. Іх цікавяць снарады. Яны клюшкі, аўтаматы, шайбы і бярвёны любяць больш за жанчын. Палітыка і сэкс у Беларусі, як і ў ЗША, маласумяшчальныя. Можна згарэць на мінэце. Навукоўцы? Мала зарабляюць. Бізнэсоўцы? Іх любяць за грошы. Хто гэта мех з грашыма будзе любіць за тое, што ён — мех? Час любові да пралетараў мінуў. Час пастаральнага каханьня зь селянінам мінуў яшчэ да дыктатуры пралетарыяту. Застаюцца артысты з паэтамі. Артысты цудоўна падыходзяць на гэтую ролю, але мы, як казаў вялікі знаўца актораў — Чэхаў, трапілі ў запіндзю, бо найлепшыя акторы — геі. Жанчыны любяць геяў, а геі адказваюць ім… сяброўствам. Сэкс-сымбаль мусіць кахаць жанчын па-сапраўднаму. Тая любоў мусіць перапаўняць яго, выпраменьвацца зь ягоных вачэй, зь цела, з жэстаў. Такое не сыграеш, не падробіш, ня купіш. Яно ці ёсьць, ці няма. У нас нацыя паэтаў; здаецца, іх процьма, выбірай на любы густ. Вось Хадановіч, але ў яго выгляд ксяндза. Адамовіч? Эміграваў. Скобла? Больш навуковец-укладальнік, чым паэт. Вішнёў? Сам пра сябе распаўсюджвае антысэксуальныя плёткі, маўляў, ён хворы на СНІД. Жыбуль? Заўсёды пад наглядам жонкі, як Ленін быў пад наглядам Крупскай. Баярын? Нігіліст, такіх любяць толькі паплечніцы. Патаранскі? Больш падобны да артыста, чым на паэта. Дуброўскі? Падобны да праваслаўнага сьвятара-пачаткоўца. Антонаў? Ён жа Антанян, у яго больш пэрспэктываў стаць сымбалем на Арараце. Шукаю. Надзея на маладых. Надзея на перамены. Знайду. Абяцаю. Будзе ў Беларусі новы сэкс-сымбаль.

Праўда, у маіх пошуках моцна перашкаджае залежнасьць сучаснага чалавека ад архітэктурных ансамбляў. Ад помнікаў мы моцна залежым. Калі некага ўшанавалі манумэнтам — значыцца, ён і ёсьць сымбалем мужнасьці, мужчынскасьці і патэнцыі. У Беларусі помнікі надзіва антысэксуальныя. Дзяды Талашы з «калашамі», хлопцы з гранатамі, дзядзькі з аўтаматамі. Сымон-музыка без смычка. Скрыпка ёсьць, дзяўчына ёсьць, а смычка няма. Нават Купала ўцякае ад аголеных русалак. У іншых народаў помнікі вельмі сэксапільныя. Давід Мікелянджэлаўскі на вуліцы голы стаіць. Рамзэс у Каіры ня проста помнік фараону, а помнік мужчыну, які меў больш за 600 жонак. А нашы помнікі захутаныя ў палітоны, зь зімовымі каскамі на галовах. Максім Багдановіч у бронзавым абліччы больш падобны да батаніка, які зьбірае расьліны ў гербарый, чымся да паэта, які спакусіў чужую жонку. Адно мяне цешыць: нашы помнікі сэкс-сымбалям яшчэ наперадзе, у гістарычнай пэрспэктыве і станоўчасьці. Таму рушым хутчэй, таму…

I like to move it! Move it!!! I like…

*28 ліпеня 2003 г.*

# Сэкс-сымбаль Лёнік Тарасэвіч

Сэкс-сымбаль — чароўнае слова-пустадомак, якое дапамагае імгненна прыцягнуць увагу суразмоўцы да чыёйсьці асобы.

Давялося распавядаць прыяцельцы, хто такі Лёнік Тарасэвіч. І я не знайшла нічога лепшага, як ляпнуць: мужчына, годны ва ўсіх адносінах, больш за тое, ён — сэкс-сымбаль. Угледзеўшы зацікаўленасьць у вачох сяброўкі, працягнула «характарызаваць» знакамітасьць: такі сабе невялікага росту дзядзька, не раўнуючы Швэйк, з рудымі няголенымі пашчэнкамі, заўсёды рухавы, заўсёды ў чорнай кепцы й такім самым строі. Малюе аграмадныя карціны, якія ўзрушаюць увесь сьвет, гадуе паўлінаў, займаецца культурніцкай палітыкай. Бяда, што ня менскі: беластоцкі. Жыве ў Валілах, вёсцы на культурным памежжы. Газэты пішуць, што эксцэнтрык, а ён аднолькава, здаецца, пагардліва глядзіць і на Варшаву, і на Менск ды кажа, што на беднай зямлі растуць найпрыгажэйшыя кветкі, што ня шмат бачыў людзей, якія сапраўды кахалі ў сваім жыцьці.

Спыняюся, каб сербануць пастылай кавы й набраць паветра:

— Адным словам, ідзі й глядзі, што трэба глядзець: у акенцы Google.com. Лявон Тарасэвіч. Leon Tarasewicz. У Менску пакуль гэтага няма.

* * *

Сканчаецца жнівень, праз колькі дзён ісьці на заняткі. Распрацоўваючы праграму на спэцкурс па гісторыі культуры XX ст., я раптоўна схамянулася, занатаваўшы ў тэму культурных памежжаў імя Лёніка Тарасэвіча. Схамянулася, бо прыгадала, як у дзясятай клясе, пачынаючы сучасную беларускую літаратуру, наш настаўнік распавядаў: «Уявіце, іду я паркам Чалюскінцаў, а насустрач — Адам Глёбус з жонкаю Аленаю Адамчык, грацыёзнай бляндынкай…» Чацьвёра нашых хлопцаў, пятнаццаці-шаснаццацігадовых бэйбусаў, ураз кідалі коцаць сшыткі й сьлініць папяровыя шарыкі… каб недаверліва слухаць. …Дамавікамэрон… Дэкамэрон… паэта Анемпадыстаў, …між іншага бізнэсовец і гаспадар крамы «Зеркала. Стекло» во зусім недалёк ад нашае школы, які знае толк у кветках (бо дызайнэр)… Адным словам, суч. бел.літ., як пісалі ў дзёньніках.

Мы звыкла лічым, што толькі масавая культура й аўтары нараджаюць герояў — сэкс-сымбаляў. Апошнія, вядома, шоўмэны. Дзіўным чынам забываемся на тое, якімі словамі й выразамі «характарызуем» вядомых сучасьнікаў і проста знаёмцаў сям'і. «Казанова», «сэкс-сымбаль», «ва ўсіх адносінах… герой» расквечваюць нашую гаворку, дзе-нідзе адмыкаючы ў зьдзіўленага суразмоўцы наўзаем хвалю мацяршчызны, часам больш сакавітую, чым уся айчынная тэлевізія. Высокае й нізкае пераплятаецца, як быццам бы хто зблытаў у батлейцы паверхі, і зьверху, з сваіх «Шабаноў», безгалосыя, мы пазіраем на беластоцкіх і небеластоцкіх сучасьнікаў.

**Аля Сідаровіч**



АРТУР КЛІНАЎ

Ева Вежнавец

# Менскія залёты

**Ён:** Я зайшоў па даведнік і ўбачыў новенькую. Мела вялікія, вільготныя цёмныя вочы, лёгкія валасы, худы твар з тонкімі рысамі, нечакана моцны падбародак. А галоўнае — выгін шыі як у Нэфэрціці!!! Такога выгіну я ніколі ня бачыў у жывой жанчыны. Я думаў аднесьці яе да тыпу «яблынька» — стройнае дрэўца, на якім клубы і грудзі, як дзьве пары сьпелых пладоў. Але калі яна ўстала, выявілася, што яна тыпу «гітара» — сярэднія грудзі, вельмі вузкая талія і шыкоўная, вялікая, тугая… якое выбраць слова? «Задніца», «дупа» тут не пасуюць. «Жопу» забараніў Міхаіл Падгайны. І ўвогуле, чаму гэтую мілую і важную частку цела называюць так груба? Таму, што «органы каханьня тэрытарыяльна супадаюць з органамі выдзяленьня»? Не, я таемна падабраў слова для яе ладнай «часьцінкі» — ступка.

Яна працуе ў суседнім офісе — з шкляной сьцяной на калідор. Калі паліць на канапцы насупраць шкляных дзьвераў, можна хутка пазнаёміцца.

**Яна:** Чалавек з суседняй фірмы штодня тырчыць насупраць нашага офісу і літаральна пасьвіць мяне. Як я не люблю гэтай хамскай звычкі — жэрці вачыма чужое цела! Нават найтанчэйшыя, найразумнейшыя мужчыны саўгаюць вачыма, варта табе адвярнуцца. Мурашкі бягуць па ўсім целе ад іхных позіркаў! Узьнікае мяшанае пачуцьцё асалоды, гонару за сваё цела й пагарды да мужчын. Ты шукаеш у іх розуму, самадастатковасьці, пачуцьця гумару etc., а яны, як сьцьвярджаюць псыхолягі, кожныя 30 сэкунд думаюць пра сэкс. Якая пошасьць гэтыя іхныя показкі! А сэкс-фантазіі, што яны дасылаюць на адпаведныя сайты, такія кандовыя і ўбогія… Аднак я ўсё адно штовечар лезу на парнасайты і скачваю гэтыя «сачыненьні» на вечную тэму. Жанчыны ж з усёй іхнай тонкасьцю й розумам аніяк мяне не ўзбуджаюць. Хоць псыхолягі й цьвердзяць, што ўсе людзі — бісэксуальныя па сваёй прыродзе. «Вось і вер пасьля гэтага людзям»!

**Ён:** Яна мяне заўважыла. Цікава, гэтая пагарда, што стаіць у чорных вачох, — праўдзівая ці ўдаваная? Зрэшты, наўрад ці яна сама гэта разумее. Жанчыны такія актрысулі й хлускі, што самі з сабой загульваюцца. Я зьбіраюся закахаць яе ў сябе і завесьці стасункі. Кветкі, кавярні, боўлінг зь півам, конныя, лодачныя або роварныя шпацыры — і першы сэкс. Гэта вельмі аздабляе жыцьцё. Калі яна будзе добрая ў ложку, там паглядзім, можа, варта й ажаніцца. Мне ўжо 34, пара. Заўтра падыду да яе ў абед.

**Яна:** Я так і ведала! Сяджу ўчора адна ў цокальнай кавярні. Падыходзіць з тацаю, поўнай ежы: «У Вас вольна?» Азіраюся вакол — прыдрацца няма да чаго, усе столікі занятыя. Халаднавата кажу: «Калі ласка». (Чаму мужчыны гэтулькі ядуць?) Сядае, уключае ўсьмешку. Я расьцягваю рот у адказ. Ой, Божухна, які сум: зараз пачне клеіць.

Але прыляцеў да мяне птах абламінга! Ён сказаў толькі парачку ветлівасьцяў, як належыць незнаёмаму суабедніку. Потым пажадаў смачна есьці, падняўся і пайшоў… Я нічога не разумею: ён зацікаўлівае мяне ці што? Ведае, пэўна, што жанчыны кідаюцца на «ўхадзяшчую натуру». Мо кінуцца? Яму трохі за 30, як і мне, у яго добрая пастава, ня тлустая, не дрыготкая, але й не перакачаная. Вусны цьвёрдыя, не такі курыны пупок, як у майго начальніка. Акуратныя рукі: пальцы не пузатыя, пазногці высакароднай формы. Вельмі прыгожы твар, і зубы ў парадку. Парфума, здаецца, «Kenzo»; апрануты дорага, някідка і трохі распушчана — там гузічак расшпілены, тут гальштучак апушчаны, шкарпэткі гульлівых расфарбовак. Напэўна, трусы носіць з выявамі кракадзільчыкаў-маркітантаў. Кашулі ж і штаны строга клясычныя. Падобна, клерк сярэдняга зьвяна, але вальнадумны, сабе наўме. Трэба прайсьціся каля ягонага акварыюму і паглядзець, хто ж ён паводле гіерархіі. Бо весьціся зь пісарчуком жанчыне майго кшталту ня варта — я буду яго зьневажаць.

**Ён:** Рыбка клюнула. Бачу, гуляе каля маіх дзьвярэй туды-сюды, кідае пэрыфэрыйныя позіркі. Пацешна, што жанчыны думаюць, быццам бакавы позірк уздоўж шчакі незаўважны для аб'екта! Апранула гарнітур апэльсынавага калёру, спадніца вышэй за калена. Сьветленькія сабо, валасы высока ўзьняла. Значыць, ведае пра харавство сваіх шыі ды патыліцы. Цікава, ці разумная яна, ці цікавая. Можа, ізноў «кухарчыіна дачка»? Ну, калі што, заўжды можна даць лататы.

Дзе нанесьці наступны ўдар? У кавярні — цьмяна, пошла і бяскрыла… Было ўжо. А можа, вычакаць, калі сама дасьпее? Даводзіць яе палымянымі позіркамі — хай пабулькае ва ўласным саку. А калі пабачу, што траціць інтарэс, давядзецца штосьці прыдумаць. Па-мойму, яна ходзіць у цокальную цырульню, магчыма, што і ў трэнажорку. Пачакаю пакуль…



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

**Яна:** Ён глядзіць на мяне такім позіркам, што ў маім касьцюме плавіцца поліэстэравая ніць. Але не зьбліжаецца. Саромеецца? Вычэквае? Трэба будзе неяк падштурхнуць яго. Па-мойму, ён ходзіць у карпаратыўную цырульню…

**Ён:** Мінуў тыдзень. Працы было вышэй за дах, сядзелі да ночы, потым ішлі ў лазьню. Я адчуў, што ў адносінах з суседкаю паўза пачала зацягвацца. Мой імпэт патроху сыходзіць. Варта было адразу весела, шчыра, без выкрунтасаў пазнаёміцца ў сталоўцы. А гэтая гульня…

**Яна:** Ужо тыдзень мінуў. Паўза доўжыцца. Ягоныя позіркі ўсё больш сумныя. Відавочна, ён траціць надзею. А я адчуваю, што ён пачынае мне падабацца. У яго такі прыемны, чыста мужчынскі голас, багаты, цёплы, фактурны. Ён часта жартуе й сьмяецца з сваімі супрацоўнікамі. А аднойчы ў абед узяў цёмнага піва. Па-першае, цікава, што насьмеліўся ў карпаратыўнай сталоўцы пасярод рабочага дня пацягваць піва. Іншыя, калі хочуць выпіць, не псуючы рэпутацыі, — лык хуценька 50 грамаў і «Пэтразэлікапсам» заядуць. А ён адкінуўся на крэсла, рукі паралельна выклаў на стол і глядзіць паўз келіх некуды. У паставе столькі самавітасьці й задуменнасьці! Па-другое, цікава, што ён п'е густы портэр, да якога штаны прыліпаюць. Звычайна мужчыны, у адрозьненьне ад нас, п'юць сьветлую, горкую й моцную бурду. Падобна, што гэта нешараговы чалавек.

**Ён:** Чым больш я халодаю, тым гарачэйшыя і вільготнейшыя робяцца яе позіркі. Учора раніцай адмыслова сутыкнулася са мной на выхадзе з трэнажоркі. Я павітаўся і ўсьміхнуўся, але прыпыняцца ня стаў. Клянуся, у панядзелак падпільнуе мяне ў страўні! Хоць цела й твар у яе някепскія, характар мне наўрад ці спадабаецца: занадта рэзка пераходзіць ад халоднасьці да гарачыні. Вось ужо за чыё сэрца не прыйдзецца доўга змагацца. Адно цікава: зваротны пераход — ад палкасьці да холаду — хуткі ў яе ці не? Пабачым.

**Яна:** Справа дрэнь: я пачынаю ўлюбляцца. Цэлы ўік-энд чакала працы, як сьвята. Службовыя абавязкі абцяжарваюць: хочацца сядзець і думаць пра яго. Яшчэ зьвечара ў нядзелю прадумвала вопратку, макіяж. На гэтым этапе трэба або пазнаёміцца бліжэй, або адвярнуцца. Я выбіраю першае. Хто не рызыкуе… і г.д.

**Ён:** Так і ёсьць! Сяджу ўчора, абедаю, ужо ўсе столікі занятыя. У разгар абеду ідзе мая прынцэса з тацаю — яўна вычэквала, пакуль столікі будуць пазайманыя. Сядае да мяне, вітаецца, ўсьміхаецца, шчабеча: надвор'е, якасьць страваў — усе тэмы пайшлі. Я ветліва адказваў, але мяне браў одум: не хачу яе ўжо, а яна на той стадыі, калі пачынаюць гнацца за няўлоўным Джо. Я ўглядаюся ў яе ўважліва: ці ня з тых яна жарсных натур, якія гадамі перасьледуюць мужчыну — лістамі, поглядамі, «выпадковымі» сустрэчамі? Непадобна: цётка эфэктная, самаўпэўненая. Але вочы насьцярожваюць. З кожным днём яны робяцца ўсё больш вільготныя, чорныя й глыбокія. Як дзірка ў космасе. Тут патыхае жарсьцю. Трэба адсоўвацца.

**Яна:** Ён уважліва глядзеў на мяне падчас абеду, але не зрабіў кроку насустрач. Яму трэба дапамагчы. Тут можа быць страх перад зьбліжэньнем з жанчынамі, засвоены ў дзяцінстве, унутраная сарамлівасьць або душэўная лянота. Што б гэта ні было, я хачу паспрабаваць з гэтым чалавекам!

**Ён:** Яна проста на вочы лезе! Жанчына, якая выйшла на ловы, абражае пачуцьцё лоўчага, якое я так паважаю ў сабе. Сьвет набывае рысы unisex, і ўсім навокал гэта даспадобы, толькі ня мне, ня мне! Я — паляўнічы, якога паспрабавалі зьвесьці да ролі дзічыны. І я буду жорсткі, пакажу ёй, што мяне нельга дамагацца, быццам я трапяткая самка. Што ж, відаць, сапраўды мужчына ўва мне мацнейшы за чалавека.

**Яна:** Я перапыняю барацьбу, хоць унутры мяне ўсё быццам перцам пасыпана, горкім-горкім, пякучым. Я кахаю. Мужчына і жанчына — як цень: ты — да яго, ён ад цябе. Я думала, што ў наш час можна даць мужчыну зразумець, што ён табе падабаецца — бяз боязі быць навязьлівай. Няўжо жанчына заўжды павінна хлусіць і граць, акторстваваць у кожным руху свайго сэрца? Так нядоўга дахлусіцца да поўнай страты сябе. Так, я спыняю сваю барацьбу, хаця кожны ягоны позірк, і паварот галавы, і сьмех, і голас ірвуць мне душу. Я ледзь магу жыць. І не разумею: што гэта са мной? Я, 30-гадовая кабета, у якой мужчынаў было хіба трохі менш, чым у Мэсаліны, закахалася ў чалавека, які ня даўся нават пагаварыць як сьлед! Мне сьвет не наўме.

**Ён:** Аціхла. Схуднела. Часта задумваецца, узіраецца ў акно. Здольнасьць *усіх* жанчын да ўзіраньня ўдалеч, складаньня лірычных вершаў, пісаньня лістоў і дзёньнікаў я заўжды лічыў чымсьці непаўнавартасным. Нейкім чынам гэта нітуецца зь іхнай гатоўнасьцю прысыхаць і прыліпаць душой. Я ўсё яшчэ мару сустрэць тую, якую пакахаю я і якая не адразу адкажа мне ўзаемнасьцю. А пакуль баўлю час зь сябрамі або сам.

**P.S.** Але які ў яе выгін шыі!

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Ліпскі У. Бацькі і дзеці:** Дзёньнікі. — Менск: Беллітфонд, 2002. — 327 с.: іл. 2000 ас.

Старшыня праўленьня Беларускага дзіцячага фонду публікуе свае дзёньнікавыя занатоўкі. Цана 4500 руб.

**Нямецка-беларуска-расейскі слоўнік** / Пад агул. рэд. У.Марцінеўскага, П.Садоўскага. — 2-е выд., папр. і дап. — Менск: Беларуская энцыклапэдыя, 2003. — 269 с. 3000 ас.

Невялікага аб'ёму слоўнік дапамагае перакладаць нескладаныя нямецкія тэксты на беларускую або расейскую мову.

**Нясьвіскія зборы Радзівілаў: іх фармаваньне, гістарычны лёс, цяперашняе месцазнаходжаньне і шляхі выкарыстаньня** / А.Мальдзіс і інш. — Менск: Беларускі фонд культуры, 2002. — 368 с. — (Вяртаньне; Кн. 7). 400 ас.

Прыдбаць выданьне можна ў «Акадэмкнізе», дзе яно каштуе каля 8000 руб.

**Кавалеўскі А. Адмысловыя гульні:** Вершы. — Менск: Логвінаў І., 2003. — 184 с. 500 ас.

Багацьце алітэрацыяў і мэтафараў, тонкая гульня з словам — такімі рысамі вызначаюцца творы, што ўвайшлі ў першы зборнік аўтара.





**Рыжы Ю. Мой крыж: Успаміны і разважаньні.** — Асінінг, 2003. — 112 с. Наклад абмежаваны

Юры Рыжы — першаярарх Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай (народнай) царквы — коратка апісвае гісторыю й сучасны стан беларускага аўтакефальнага праваслаўя, раскрывае адметныя старонкі сваёй біяграфіі.

**Сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі ў 2002 годзе.** — Санкт-Пецярбург: Неўскі прасьцяг, 2003. — 205 с. 1000 ас.

Выданьне, падрыхтаванае сябрамі Беларускай асацыяцыі журналістаў, знаёміць з станам мас-мэдыя і праблемамі свабоды слова на Беларусі ў 2002 г.

**Шамякін І. Збор твораў. Т. 2. Трывожнае шчасьце:** Аповесьці. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 527 с.

За 5530 руб. у большасьці менскіх кнігарняў ахвотныя могуць прыдбаць памятную са школы пэнталёгію «Трывожнае шчасьце».

**Макушников О. Гомель с древнейших времён до конца XVIII века:** Историко-краеведческий очерк. — Гомель, 2002. — 244 с. 600 ас.

У адной кнізе аўтар паспрабаваў сабраць усё самае цікавае з «дарасейскай» гісторыі гораду. Апісаньне пэрыяду ВКЛ ды Рэчы Паспалітай выйшла нейкае нэўтральнае. Маўляў, добра гэта ці не? Ці можам мы гэта сабе дазволіць ужо, ці не? Як бы там ні было, але супраць праўды не папрэш — білі люд тутэйшы і чужынцы, і свае… нібыта. Спадабаліся тыя ўрыўкі, дзе разглядаюцца ды аналізуюцца археалягічныя знаходкі старога гораду (у аўтара ёсьць і іншыя кнігі, прысьвечаныя археалягічнаму дасьледаваньню Гомеля і ваколіцаў). Цікавыя малюнкі зробленыя Ю.Луніненка. Асабліва ўражвае выява Гомелю XII ст. на вокладцы: можна заўважыць дзьве мураваныя царквы. Частку дакумэнтаў, пададзеных у кнізе, можна было знайсьці на старонках двухтомніка «Памяць», прысьвечанага Гомелю, але сустракаюцца і раней невядомыя чытачам. Прадаецца кніга ў Гомелі, каштуе 7310 руб. Напэўна, зьявіцца і ў менскіх кнігарнях.

**Слоўнік тыпу INSITU беларускай мовы:** Слоўнік, граматычны даведнік і збор тэкстаў для вывучаючых беларускую мову / НАНБ; Аб'яднаны ін-т праблемаў інфарматыкі; А.Дабралюбаў, Н.Маргун і інш. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 431 с.

Сыстэма, паводле якой складзены слоўнік, запатэнтаваная аўтарамі як вынаходка. У першай частцы кнігі зьмешчаныя каля 9000 лексычных адзінак са спасылкамі на старонкі другой часткі, дзе гэтыя словы сустракаюцца ў караценькіх тэкстах інфармацыйнага характару пра Беларусь, асноўныя падзеі з гісторыі чалавецтва, а таксама ва ўрыўках з твораў мастацкай літаратуры. Такім чынам, слоўнік-падручнік дазваляе самастойна вывучаць беларускую мову без звароту да іншых навучальных дапаможнікаў. Цана ў шапіку ў Акадэміі навук — 7600 руб.

**Озеров Г. Тайна княжеских замков: Историческая хроника. Создана по стародавним источникам.** — Вільня, 2002. — 184 с.

Выданьне ёсьць працягам гісторыка-мастацкага расповеду пра князёў ВКЛ, якія распачалі кнігі, прысьвечаныя Даўмонту й Альгерду. Гэтым разам у цэнтры твору — постаць Вітаўта Вялікага. Асноўнымі крыніцамі для «мастацкае» рэканструкцыі сталіся працы расейскіх гісторыкаў — ад Карамзіна да Гумілёва, а таксама летапісы. Кніга прадаецца ў «Падпісных выданьнях» і ў шапіку Акадэміі навук. Цана кнігі — 7000 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**

**Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч** паказаў язык усім тым, хто яго кепска ведаў. Ці, можа, гэта зрабіў гр.Вядзьмак-Лысагорскі?


Ніл Гілевіч

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Сяржук Салаш, каардынатар грамадзкай ініцыятывы «За чысты Барысаў»**, з сваімі хлопцамі правёў зачыстку гораду над Бярэзінай. Яны ліквідавалі несанкцыянаваную звалку ў Залінейным раёне Барысава. Сьмецьця сабралі сто мяхоў. Дамовіліся з транспартам, каб яго вывезьці. Мясцовыя жыхары дапамагалі інструмэнтамі ды «салёнымі гуркамі». Во б Салаша ды ў парлямэнт!

**Гарадзенка Часлава Сямяновіч** сабрала больш за мільён рублёў на крыжы ў Курапатах, абыходзячы кватэры, прыватныя дамы, прыгарадны кірмаш. Дзясяткі гарадзенцаў адгукаюцца на яе просьбу. На тыя грошы ўдалося зрабіць 500 крыжоў.

**Паўлюк Канавальчык, галоўны рэдактар газэты «Навінкі»**, выкупіў у дзяржавы маёмасьць бацькоў, сплаціўшы 515 000 руб. (трацінa ўсяе сумы штрафу). Маёмасьць меліся канфіскаваць па выніках судовага працэсу супраць Паўлюковай газэты. Добры сын, дарма што анархіст.

**Павал Мажэйка** аднаўляе гарадзенскую прапіску і пашпарт: тэрмін пакараньня за «абразу прэзыдэнта» скончыўся. Павал яго вытрымаў годна. Тэрміны іншых «крыўдзіцеляў» — Віктара Івашкевіча і Міколы Маркевіча — сканчаюцца ў сьнежні 2003-га і ўвесну 2004-га адпаведна.

**Віцебскія зуброўцы** «беларусізавалі» вёскі Пліса, Кішы, Зябкі, Празарокі, Перадолы і Перавоз на Глыбоччыне. Жыхары скардзіліся: на ўездах ставяць шыльды з расейскамоўнымі назвамі. Дык «зубры» павыпраўлялі надпісы на беларускія.

**Чатырохгадовая дзяўчынка з-пад Баранавіч** атруцілася грыбамі-парасонікамі. Уратаваць яе не ўдалося. Дарма людзі зьбіраюць розныя «ўмоўна-ядомыя» грыбы.

**Акадэмік Падлужны,** каментуючы ўсталяваньне ў Полацку помніка літары «Ў», адзначыў, што яна — лішняя ў беларускім альфабэце. Дагэтуль дырэктар Інстытуту мовазнаўства ваяваў толькі супраць мяккага знаку.

**Джэфры Лі Парсан зь Мінэсоты** арыштаваны ФБР. Яго падазраюць у стварэньні кампутарных вірусаў MSBlasta і Sobig.F., што сапсавалі амаль мільён амэрыканскіх кампутараў. Хакеру толькі 18 гадоў. Расьце новае пакаленьне.

**Махамэд** — самае папулярнае сёлета мужчынскае імя ў Брусэлі. Ва ўсёй Бэльгіі нарадзілася найбольш Ляраў, Марыяў, Тамашоў і Лукашоў. За мінулы год насельніцтва краіны пабольшала на 46 тыс. чалавек — цяпер бэльгійцаў 10 млн 355 тыс. А казалі — Эўропа вымірае.

**Юры Лужкоў, мэр Масквы,** зьбіраецца ўсталяваць ва ўсіх школах расейскае сталіцы брамкі з мэталашукальнікам і званкі трывогі. Каб гэткім чынам прадухіляць тэракты. Хоць мэтазгодней было б змагацца зь іх прычынаю — чачэнскай вайной.

**Сяргей Мікулевіч**

Новы амэрыканскі пасол Джордж Крол прычараваў Менск прывітальнай прамовай, сказанай каралеўскай беларускай мовай без шпаргалкі. «Я адчуваю сябе як дома», — гаворыць ён. На беларускім дыпляматычным фронце Крол зь перапынкамі працаваў ад самага пачатку, з 1992 г. Прэс-сакратар МЗС Савіных рассыпаўся ў кампліментах. Дарэчы, пасол славянскае Расеі сп.Блахін беларускай мовы пакуль не асвоіў.


Крол

IREX-PROMEDIA



Зачыстка Барысава

# Kryžavanka łacinkaj



**Na haryzantali:**

1. Čałaviek, jaki adčuvaje hidlivaść da inšych ludziej. 4. Papiaredniaja zarpłata. 6. «Hołas» ciahnika, a taksama narodny muzyčny instrument. 7. Hrašovaja adzinka VKŁ, ledź nia viernutaja ŭ pačatku 1990-ch. 9. Tak klikali Kahanca. 10. «Za našu i vašu ...» 11. Aznačeńnie bujnoj rahataj žyvioły (nie «chudoba», nie «skacina» i nie «tavar»). 15. Videlec dla siena. 16. Biełaruski rok-hurt, chvory na rok-n-roł. 18. U vajskoŭcaŭ heta nazyvajecca «vodnaja pieraškoda». 20. «Darma pracuje … u poli pad Harodniaj» (NRM). 21. Spradviečny žychar peŭnaje miascovaści, synonim «tutejšaha». 22. Taniec, cymus jakoha ŭ hučnym laskańni abcasami ab padłohu. 24. Specyjalnaja siakiera, kab siači drovy. 26. Nazva amerykanskaj kaśmičnaj ahiencyji. 28. Rukatvornaje ŭzvyšeńnie. 29. Vajskovaja farmacyja, ściah jakoj chavaŭ hieroj paemy Kulašova. 32. Biełaruski nazoŭ litoŭskaha horadu Šaŭlaj. 33. Estonski ŭniversytecki haradok. 35. Vyspa klubnaje kultury ŭ Hišpaniji, turystyčny raj. 37. Movaznaŭca, palityk, radny BNR, dziadźka Jakuba Kołasa. 38. Maštabny arkiestravy muzyčny tvor.

**Na vertykali:**

1. Izrajilskaja vyviedka. 2. Sakretnaje słova. 3. Pa-litoŭsku «Vitis», pa-nasku — …. 4. Krynica dzionnaha śviatła ŭ chacie. 5. Pamianšalnaje ad «Stanisłaŭ», a taksama proźvišča biełaruskaha chakiejista. 6. Staradaŭni instrument, kštałtu cymbałaŭ, prydatny dla piajańnia baladaŭ. 8. Zdradnik z bykaŭskaha «Sotnikava». 9. Trochkutnaja padporka, detal u mechanicy. 12. Proźvišča prezydenta BCR, a taksama vydatnaha rasiejskaha dramaturha. 13. Miastečka na race Łyntupka. 14. Pieranosnaja leśvica. 15. Ad jaho kamputar moža lasnucca. 16. Mahutnaja šyja, na jakuju možna sieści i nohi źviesić. 17. Imia małodšaha z bratoŭ Łuckievičaŭ. 19. Raka, što natchniła Kupału na napisańnie paemy. 23. Hrukat ad ruchu noh. 25. «Prymuś siabie žyć u ...» (nazva horadu ŭ naźvie apaviadańnia) 27. Maleńki abaranak. 30. Napadnik futbolnaj zbornaj Hišpaniji. 31. Lasny kaban. 34. Zahadka z malunkaŭ i symbalaŭ. 36. Horad, dzie adbyvajecca hran-pry Italiji ŭ «Formule-1».

**Skłaŭ Vital Stachijevič**

## *Віншуем* *Зьмітра*

*і Таццяну Бартосікаў*
*з нараджэньнем дачушкі! Хай будзе ў радасьць бацькам і дзядам. Нашаніўцы*

**Сябры ЗБМ «Беларускі Шлях»**

запрашаюць 7 верасьня (нядзеля) на падарожжа **Дуды — Іўе — Ліпнішкі — Суботнікі — Геранёны — Воранава — Канвелішкі — Гайцюнішкі — Беняконі — Ліда.** У Полацак (рыцарскі фэст) — 13 верасьня. Т.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер).

## Крамольныя гузікі

У папярэднім нумары «НН» пісала, што ў ЦУМе прадаюцца ўцэненыя гарнітуры, на якіх гузікі з выявай «Пагоні». Літаральна праз дзень пасьля выхаду газэты, 30 жніўня, у рэдакцыю затэлефанаваў чытач і паведаміў, што наведаў гэтую краму. Гарнітуры насамрэч знайшоў, але гузікаў на іх... ужо не было: работнікі ЦУМу пазразалі ўсе чысьцютка гузікі з усіх гарнітураў. Мо на сувэніры?

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**Гурткі для дзяцей**

Фальклёрныя гурткі «Ветах», «Верас», «Гронка» запрашаюць дзяцей 5—12 гадоў знаёміцца з традыцыйнай культурай і быць актыўнымі ўдзельнікамі. У гуртках яны набудуць веды па народнай харэаграфіі, аўтэнтычных сьпевах. Мастацкі кіраўнік Тацяна Пладунова. Даведкі праз т.: 227-04-96, 283-21-96 (увечары). Прагляд-праслухоўваньне 13 верасьня а 18.00 па адрасе: вул.Кірава, 14 (глядзельная заля), Менск. Можна прыходзіць без папярэдняга тэлефанаваньня.

**ВІТАНЬНІ**

**Мама!** Віншую цябе з Днём нараджэньня і жадаю здароўя, бадзёрасьці і цярпеньня. Сын-жаўнер

**КАНТАКТЫ**

**Мужчына-пэнсіянэр**, 57 гадоў, шукае жонку 35—50 гадоў. Кватэра. Добразычлівы, ласкавы, дзяцей няма. Т.: 254-66-02. Міхась

**8 верасьня** а 19-й на Ўправе БНФ (вул.Варвашэні, 8) адбудзецца сьвяточная сустрэча з гісторыкамі ды бардамі. Запрашаем усіх!

**Аўтобус на Крапівенскае поле** адыходзіць 6 верасьня а 14-й ад Акадэміі навук. Месца ў ім каштуе 10 тыс. руб. Вяртаньне назад — а 8-й раніцы назаўтра. Даведкі па т.: 284-50-12

**Пераканаўчы** досьвед авалодваньня і асабістага змаганьня за мову ў №26—29 газэты «Наша слова». Чыталі? Т.: 223-07-43. Беларус, які варушыцца

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Прадаю** часопісы «Роднае слова» (1996—2001 г.). Т.: 270-45-64

**Прадаю** касэты й кружэлкі беларускіх гуртоў у Жлобіне. Т.: 52-7-56. Эдуард

**ПРАЦА**

**Вырашэньне** кампутарных праблем. Дапамога ў выбары і набыцьці кампутара. Т.: 264-68-90

**Вышываю** традыцыйныя беларускія кашулі, тку паясы на дошчачках. Т.: (8-02322) 30-542. Тацяна

Шчыры дзякуй усім, хто павіншаваў мяне зь юбілеем. Абяцаю дажыць да наступнага.

**Уладзімер Арлоў**

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ______

Імя і прозьвішча ______

Адрас, тэлефон ______

IN MEMORIAM

## Павал Гуз

Сумная навіна прыйшла з Мэльбурну. На 80-м годзе жыцьця пасьля цяжкой хваробы пайшоў з жыцьця Павал Гуз, старшыня Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў штаце Вікторыя, стрыжань беларускага жыцьця ў Мэльбурне. Пад псэўданімам Паўлюк Дуброўскі ён друкаваў свае нататкі пра жыцьцё беларусаў у Аўстраліі ў газэце «Беларус». Нягледзячы на цяжкую хваробу і страту голасу, да апошняга часу актыўна ўдзельнічаў у беларускім жыцьці, пісаў рэфэраты і адозвы.

**Натальля Гардзіенка**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3502. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 01.00 3.09.2003.
Замова № 4550.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а